© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

WHITERUTHENIAN NEWSPAPER "BACKAUSCYNA" ("FATHERLAND")

Responsible Publisher: Wladimir BORTNIK

Druck: „LOGOS", Buchdruckerei u. Verlag, G.m.b.H.
München 8, Rosenheimerstr. 46 a.

Post Adress: "Backauscyna", München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III
Die Administration der Weißruthenischen Zeitung „BACKAUSCYNA"
München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND" | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND" | LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE"

№ 18 (149) Нядзеля 3 травеня 1953 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 7

Цяжкая нямецкая праблема

ВЫКЛЮЧНАЯ РОЛЯ Й ЗНАЧЭНЬНЕ НЯМЕЧЧЫНЫ

У халоднай вайне між камуністычным Усходам і дэмакратычным Захадам першае й найважнейшае месца займае бясспрэчна Нямеччына. Усё астрыё халоднай вайны накіраванае Савецкім Саюзам да таго, каб недапусьціць да ўключэньня Заходняй Нямеччыны ў сыстэму заходня-эўрапэйскай абароны, а заходнімі дзяржавамі — да ўдзелу Нямеччыны ў эўрапэйскай абароннай супольнасьці.

Заходнія дзяржавы, а ў першую чаргу Задзіночаныя Штаты Амэрыкі, поўнасьцю пераканаліся, што бяз удзелу Нямеччыны аб абаронных плянах Заходняй Эўропы ня можа быць і мовы. Ня меней перакананыя аб гэтым і правадары Савецкага Сюзу, якія ўжываюць дасьлоўна ўсіх магчымых спосабаў, каб Заходнюю Нямеччыну вырваць з пад уплываў Захаду й прынамсі яе знэўтралізаваць. Разумеюць гэтае сваё выключна важнае значэньне й Немцы і стараюцца гэтым як найболей для сябе вытаргаваць ад Захаду.

Ува ўсім гэтым няма нічога дзіўнага. Жыцьцяздольны, працавіты й здысцыплінаваны 70-мільённы нямецкі народ, абдораны незраўнанымі мілітарнымі якасьцямі, які знаходзіцца ў самым цэнтры Эўропы, зьяўляецца вырашальнай сілай на цэлым эўрапэйскім кантынэнце, безь якой няма й Эўропы. Зь кім будзе Нямеччына, з Захадам ці Ўсходам, за тым будзе бясспрэчная вырашальная перавага, а ў выпадку вайны і перамога.

Заходня-эўрапэйскія вялікія дзяржавы, Францыя й Вялікабрытанія, якія яшчэ да першай сусьветнай вайны прадстаўлялі сабой сусьветную магутнасьць, што магла раўнаважыць, а навет перавышаць ролю Нямеччыны, знаходзяцца сяньня ў стадыі рэгрэсу й заняпаду. Роля Вялікабрытаніі ў сувязі з поўным унезалежненьнем ейных даміньняў і многіх калёніяў фактычна абмежавалася толькі да ейнае мэтраполіі — Брытанскіх астравоў, а Францыя загразла ў нутраным хаосе. У гэты-ж самы час Заходняя Нямеччына праяўляе моцныя тэндэнцыі далейшага прагрэсу й росту. Яна, поўнасьцю пабітая й разгромленая ў выніку апошняй вайны й бязумоўнай капітуляцыі, глыбака абрэзаная на сваіх усходніх пэрыфэрыях і падзеленая на ўсходнюю й заходнюю, хутчэй залячыла крывавыя раны вайны чымся заходня-эўрапэйскія дзяржавы пераможніцы — Вялікабрытанія й Францыя. Амэрыка дакладна здае сабе справу з таго, што Нямеччына ў сяньняшняй і будучай міжнароднай сытуацыі прадстаўляе сабой вялізарную рэальную сілу, а таму выразна вядзе сваю палітыку, каб сілу гэту мець на сваім баку.

САВЕЦКАЯ ІГРА

Але гэта самае маюць на мэце й Саветы. Ім моцна залежыць на тым, каб, калі навет ня ўдасца падпарадкаваць сваім уплывам Заходняй Нямеччыны, чаго яны ня могуць надзеіцца, прынамсі яе знэўтралізаваць, г. зн. трымаць яе ў дасюлешнім няўзброеным стане й перашкаджаць ёй вызначыцца палітычна на баку Захаду. У сувязі з гэтым Саветы стараліся ўсякімі спосабамі перашкодзіць падпісаньню нямецкім урадам у Бон генэральнага дагавору з трымя заходнімі вялікадзяржавамі аб уключэньні Нямеччыны ў сям'ю вольных народаў Захаду на прынцыпах роўнапраўнага партнэрства і дагавору аб нямецкай арміі ў рамах эўрапэйскай абароннай супольнасьці, як і стараюцца перашкодзіць сяньня ратыфікацыі гэтых дагавораў. У сувязі з гэтым Саветы праводзяць у прысьпешаным тэмпе саветызацыю акупаванай імі Ўсходняй Нямеччыны, якая мае зраўнаважыць сілы й значэньне Заходняй Нямеччыны і ў будучыні магчыма адыграць ролю Паўночнай Карэі. Дзеля гэтай сваей мэты Савецкі Саюз адцягвае ў бесканечнасьць мамэнт заключэньня мірнага дагавору зь Нямеччынай, а з другога боку параліжуе ўсякія мерапрыемствы Захаду рознымі сваімі прапазыцыямі разьвязаньня нямецкай праблемы.

Гэтак і апошнім часам адным з галоўных пунктаў новай савецкай «мірнай афэнзывы» зьяўляецца прапанова задзіночаньня Нямеччыны. Саветы якраз нядаўна выступілі зь ініцыятывай скліканьня у гэтай справе канфэрэнцыі чатырох вялікадзяржаваў (ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі й СССР). Прэзыдэнт Айзэнгаўэр у сваей апошняй прамове таксама высунуў дамаганьне задзіночаньня Нямеччыны, што мела-б быць адным з доказаў шчырасьці мірнай палітыкі новых уладароў Крэмля. Справа ўпіраецца, як заўсёды і як, у кажным іншым спрэчным пытаньні, у тое, што кажны бок зусім іначай сабе выабражае задзіночаньне Нямеччыны. У той час, калі Амэрыка імкнецца да поўнага загарантаваньня дэмакратычнай сыстэмы ў Нямеччыне, даць поўную свабоду нямецкаму народу й да ўшанаваньня волі бальшыні, Савецкі Саюз, разумеючы добра, што правядзеньне ў цэлай Нямеччыне ўзапраўды вольных выбараў пад кантроляй міжнародных ворганаў пакрыжуе ягоныя пляны й можа вырваць навет Усходнюю Нямеччыну з пад ягоных уплываў, мае ў сваіх прапановах задзіночаньня Нямеччыны зусім адваротныя да Захаду мэты.

Мы адноўчы былі выказалі прыпушчэньне, што магчыма аплаціцца Савецкаму Саюзу згадзіцца на вольныя выбары ў цэлай Нямеччыне, стварэньне супольнага ўраду для ўсей Нямеччыны й на ейнае задзіночаньне. Такім сваім крокам Савецкі Саюз мог-бы спаралізаваць акцыю рэмілітарызацыі Нямеччыны, прыступленьне яе да эўрапэйскай абароннай супольнасьці і, што найважнейшае, маральна й мілітарна абяззбро-

(Заканчэньне на 4 балоне)

Голас сумленных Палякаў

Група лёнданскіх Палякаў, што гуртуецца вакол сьціплага рататарнага часапісу-бюлетэню «Ідзэмы», ворганае «Навачаснай Хрысьціянскай Думкі», свае дачыненьні да Беларусаў і Ўкраінцаў стараецца базаваць на прынцыпах хрысьціянскай этыкі й справядлівасьці й на гэтай падставе творыць сваю канцэпцыю будучай польскай палітыкі на Ўсходзе. У вапошнім 17-18 нумары гэтага часапісу за сакавік-красавік 1953 г. знаходзім на гэтую тэму артыкул інж. А. Сьцібор-Рыльскага п. н. «Этнічны прынцып», у якім аўтар падае свой праект разьвязаньня польска-беларускіх і польска-ўкраінскіх гранічных спрэчак і непаразуменьняў.

Аўтар уважае, што ўзаемныя непаразуменьні й адсутнасьць палітычнага супрацоўніцтва між Беларусамі й Украінцамі з аднаго боку і Палякамі — з другога моцна шкодзяць абодвым баком і родзяць недавер да здольнасьці гэтых народаў згоднага разьвязаньня спрэчных праблемаў і супольнага сужыцьця ў заходніх вялікадзяржаваў, якія хапаюцца тады канцэпцыі «Вялікай Расеі». Інж. Сьцібор-Рыльскі сьцьвярджае, што тыя Палякі, якія вызнаюць права беларускага й украінскага народу на незалежнае дзяржаўнае існаваньне, высоўваюць аднак сяньня два аргумэнты супраць афіцыяльнага запэўненьня з боку польскіх афіцыяльных дзейнікаў сяньня аб іхнай рэзыгнацыі на карысьць Беларусаў і Ўкраінцаў Заходняй Беларусі й Заходняй Украіны: 1. польскія афіцыйныя дзейнікі ня могуць на эміграцыі рабіць ніякіх пастановаў у справе зьмены ўсходняй граніцы бяз згоды ўсяго народу ў краі, 2. Палякі ня могуць зрабіць такой пастановы й таму, што яшчэ ня ведама, ці Беларусь і Ўкраіна зможа атрымаць незалежнасьць, а тады у выпадку неатрыманьня незалежнасьці, такая пастанова дасьць падставы Расейцам дамагацца гэтых тэрыторыяў для сябе.

У вадказ на такую аргумэнтацыю інж. Сьцібор-Рыльскі піша: «Незалежнасьць Польшчы можа быць цяпер здабытай толькі ў выніку развалу Расеі або такога яе аслабленьня, што будзе змушаная папусьціць павады, якімі трымае ўсе нашыя народы. У гэткім выпадку трудна выабразіць, каб яна магла перашкодзіць пўстаньню незалежных дзяржаваў Украіны й Беларусі. Трэба ўжо сяньня пакінуць шкоднае й нячэснае цьвярджаньне, што „ня ёсьць яшчэ сяньня пэўным, ці гэтыя дзяржавы наагул паўстануць". Гэтым робім шкоду перадусім самым сабе, памагаючы Расеі. Правільным фактычна зьяўляецца прынцып, што канчальнае разьвязаньне спрэчных гранічных справаў можа наступіць толькі пасьля атрыманьня ўсімі намі незалежнага дзяржаўнага існаваньня і ў выніку згоды між праўнымі прадстаўніцтвамі нашых народаў, маючых поўнае да гэтага права.

Але таксама ёсьць првільным пастулят украінскі й беларускі, які дамагаецца, каб ужо сяньня быў загарантаваны й пацьверджаны прынцып з боку нацыянальных групаў, што змагаюцца за свабоду, што спрэчныя гранічныя справы будуць у будучыні, калі наступіць для гэтага адпаведні мамэнт, вырашаныя справядлівым для ўсіх спосабам паводля агульных прынцыпаў, на якія ўсе змогуць згадзіцца. Яны вымагаюць таго, каб ня мела месца тэндэнцыя выкарыстоўваньня сільнейшымі часовай слабасьці іншых».

Сьцьвердзіўшы ў далейшым, што беларуска-польскае і ўкраінска-польскае паразуменьне прынесла-б вялізарныя палітычныя карысьці для ўсіх трох партнэраў ужо сяньня, аўтар дамагаецца, каб польскі эгзыльны ўрад у Лёндане афіцыйна выказаў згоду на этнічны прынцып у будучым устанаўленьні сваей граніцы зь Беларусяй і Ўкраінай, адкладаючы канчальнае вырашэньне гэтага пытаньня да таго часу, пакуль ня выкажыцца ў гэтай справе праўная рэпрэзэнтацыя польскага народу на бацькаўшчыне. Ён піша: «Прыняцьце афіцыяльнай польскай палітыкай на эміграцыі лініі паступаньня, згодна з хрысьціянскай справядлівасьцю, і асьветчаньне, што Палякі жадаюць усе ўсходнія спрэчныя гранічныя справы разьвязаць пасьля атрыманьня незалежнасьці згодна з этнічным прынцыпам, вяло-б безадкладна да згоды й зблiжэньня Палякаў, Украінцаў і Беларусаў. Польскі ўрад на эміграцыі захаваў-бы прынцып, што ня можа завязваць ніякіх вяжучых умоваў у справе грані-

(Заканчэньне на 4 балоне)

Палітычныя Навіны

Узнаўленьне перагавораў аб перамір'і. Пасьля шасьцімесячнага перарыву былі 26 красавіка ўзноўленыя перагаворы ў Панмунджоне аб перамір'і ў Карэі. На першых паседжаньнях узгадненьне пытаньня вымены ваеннапалонных, аб якое разьбіліся ранейшыя перагагаворы, ня было дасягнутае. У той час, калі прадстаўнікі збройных сілаў ЗН запрапанавалі, каб ваенна палонныя, якія адмовяцца вяртацца на бацькаўшчыну, былі інтэрнаваныя ў Швайцарыі, як нэўтральнай дзяржаве, камуністыя высунулі дамаганьне інтэрнаваць ваеннапалонных у іншай нэўтральнай краіне і прадстаўніком іхных бацькаўшчынаў даць 6 месяцаў часу намаўляць іх да павароту. Прадстаўнікі ЗН адкінулі станоўча гэты праект.

Вымена хворых ваеннапалонных пашыраная. Згодна ранейшага дагавору збройныя сілы ЗН згадзіліся звольніць 5.800 камуністычных ваеннапалонных, а камуністыя 600 ваеннапалонных альянцкіх. Аднак 23 красавіка камуністыя заявілі, што яны згаджаюцца звольніць большую колькасьць ваеннапалонных, а альянты із свайго боку выразілі згоду таксама звольніць большую колькасьць палонных камуністых. Вымененыя альянцкія ваеннапалонныя інфармуюць, што камуністыя зь імі вельмі кепска абходзіліся й тарнавалі масавы тэрор, у выніку чаго шмат тысячаў ваеннапалонных збройных сілаў ЗН страцілі ў палоне жыцьцё.

11-ая канфэрэнцыя Рады Атлянтычнага Пакту. 25 красавіка закончылася ў Парыжы 11-ая канфэрэнцыя Рады міністраў дзяржаваў Атлянтычнага пакту, у якой прымалі ўдзел міністры замежных справаў, міністры абароны, міністры гаспадаркі й фінансаў 14 дзяржаваў, сяброў Атлянтычнага пакту. У выдадзеным камунікаце падчыркваецца, што савецкія мірныя прапановы ня ўносяць яшчэ ніякай зьмены ў небясьпечным палажэньні заходняга сьвету. Дзеля гэтага Атлянтычная Рада ўзмацняе палітыку калектыўнай бясьпечнасьці. Рада вызнала за неабходнае далейшую разбудову сілаў Атлянтычнага пакту з уключэньнем эўрапэйскай абароннай супольнасьці.

Нямеччына адлажыла ратыфікацыю дагавораў. Вышшая палата нямецкага парляманту («Бундэсрат») 24 красавіка адлажыла ратыфікацыю генэральнага дагавору з заходнімі альянтамі й дагавору аб эўрапэйскай арміі бальшынёй 20 галасоў супраць 18 да часу пакуль нямецкі канстытуцыйны суд у Карльсругэ выясьніць ці гэтыя дагаворы знаходзяцца наагул у згодзе зь нямецкай канстытуцыяй.

Захоп каралеўства Ляёс камуністымі прадаўжаецца. Камуністычныя войскі Ветміну Го-Чы-Міна, якія ўжо занялі звыш трэйцяй часьці тэрыторыі каралўства Ляёс у Індакітаі, збліжыліся на некалькі кілямэтраў да каралеўскай рэзыдэнцыі — гораду Люянг Прабанг на поўначы краіны, а на паўдні да фактычнане сталіцы краіны гораду Віентыянэ. Францускае галоўнакамандаваньне прадпрыймае меры дзеля абароны рэзыдэнцыйнага гораду. Згодна паведамленьня францускага галоўнакамандуючага ў Індакітаі генэрала Саляна, Кітайцы дастаўляюць месячна камуністычным войскам Го-Чы-Міна 2.000-3.000 тонаў аружжа. Бальшыня аўтаматычнага аружжа зьяўляецца эхаславацкага паходжаньня, а цяжкое аружжа мае на сабе кітайскія надпісы. Колькасьць кітайскіх «тэхнічных дараднікаў» выносіць каля 7.000 чалавек.

Няўдача дэгалістых на камунальных выбарах. 26 красавіка адбыліся ў Францыі камунальныя выбары, у якіх, згодна яшчэ няпоўных падлічэньняў, дэгалістыя (партыя генэрала Дэ Голя) пацярпелі вялікую няўдачу й страцілі шмат мандатаў. Прыкладам, у Парыжы, дзе дагэтуль дэгалістыя мелі 52 мандаты, цяпер атрымалі толькі 10. Камуністыя захавалі дасюлешнюю колькасьць мандатаў у гарадох, затое значна страцілі ў вясковых раёнах.

Заканчэньне пленарнае асамблеі Задзіночаных Нацыяў. 23 красавіка пленарная асамблея Задзіночаных Нацыяў закончыла сваю сэсію за пэрыяд 1952/53 году. Аднак пленарная асамблея зьбярэцца ўзноў, калі гэтага будуць вымагаць далейшыя падзеі ў Карэі.

Францускія рэформы для Індакітаю. Францускі ўрад пастанавіў правесьці рэформы ўпраўленьня ў трох дзяржавах Індакітаю — Ветнаме, Ляёс і Камбоджы з мэтаю паправы ўзаемадачыненьняў з гэтымі краямі. Кажная з гэтых дзяржаваў атрымае ў будучыні францускага высокага камісара. Палітыкай абароны будзе кіраваць генэральны камісар, ён-жа будзе заступаць Францыю ў супольных ворганах гэтых трох краінаў.

Паўдзённа-карэйскі парлямант супраць перамір'я. Паўдзённа-карэйскі парлямант прыняў пастанову, якая дамагаецца прапагандовай акцыі супраць заключэньня перамір'я ў Карэі. Дэпутаты парляманту забавязаныя вярнуцца ў свае выбарныя акругі з мэтаю асабістага пакіраваньня прапагандовай акцыяй. Паўдзённа-карэйскі прэзыдэнт Зынгман Ры высказаўся ў вадным мэмарыяле амэрыканскаму ўраду супраць усякага падзелу Карэі. Ён дамагаецца задзіночаньня Карэі шляхам «перамогі над ракой Ялю — нашай старой паўночнай граніцы».

Пасьля Грузіі чарга на Азэрбайджан і Латвію. Пасьля вялікай чысткі ў Грузіі, дзе былі арыштаваныя аўтары папярэдняй чысткі, прыйшла чарга на вялікія зьмены ў дзьвюх іншых савецкіх рэспубліках — Азэрбайджане й Латвіі. Супольнай рысай усіх гэтых чыстак ёсьць абсаджваньне ключовых становішчаў у гэтых нерасейскіх рэспубліках Расейцамі, якія заступаюць «вычышчаных» мясцовых камуністых. Другой характарыстычнай рысай ёсьць абсаджваньне важных становішчаў выразнымі прыхільнікамі Бэрыі.

Злагаджэньне тону, але толькі ў Саветах. Перад сьвятам 1-га травеня ў Саветах, як і ў сатэлітных краінах, былі апублікаваныя першатраўнявыя лёзунгі. Вось-жа лёзунгі ў самых Саветах значна лагаднейшыя й не зьмяшчаюць войстрых атакаў пад адрасам Захаду, затое лёзунгі ў сатэлітных краінах утрыманыя ў папярэдняй агрэсыўнай форме. Пры гэтым лёзунгі Савецкага Саюзу ні разу не ўспамінаюць прозьвішча Маленкава, затое ў сатэлітных краінах яно ўспамінаецца часта.

Вуніяцкі ўкраінскі архіяпіскап Львова Сьліпый паўторна засуджаны. Як паведамляе Ватыкан, вуніяцкі ўкраінскі архіяпіскап Львова Язэп Сьліпый, пасьля адбыцьця сёлета сваей кары 7 год зьняволеньня, засуджаны цяпер паўторна на 17 год зьняволеньня.

Францускі міністар замежных справаў Бідо за задзіночаньнем Нямеччыны. Францускі міністар замежных справаў Бідо ў сваей прамове, сказанай 23 красавіка на канфэрэнцыі Атлянтычнай Рады ў Парыжы, высказаўся за задзіночаньнем Нямеччыны шляхам вольных выбараў і стварэньня агульнанямецкага ўраду, які павінен сам вырашыць аб будучай палітыцы Нямеччыны. Адначасна адкінуў ён праект узброенай нэўтральнай Нямеччыны.

Амэрыканская ваенная помач Эўропе. Амэрыканскі міністар замежных справаў Даллес 23 красавіка заявіў у Парыжы, што Задзіночаныя Штаты маюць намер прызнаць для эўрапэйскіх дзяржаваў Атлянтычнага пакту ў бюджэтным 1953/54 годзе 3,6 мільярдаў даляраў на даставы ўзбраеньня і 1,5 мільярда даляраў на ваенныя заказы ў Эўропе.

Пагроза Эгіпту пад адрасам Вялікабрытаніі. Эгіпскі прэм'ер ген. Наджыб заявіў 23 красавіка на масавым мітынгу, на якім было прысутных звыш 100.000 чалавек, што Эгіпт стараецца ажыцьцяўляць свае правы мірнай дарогай, але зьяўляецца таксама гатовым у выпадку патрэбы змагацца за іх пры помачы гвалту. Вялікабрытанія й Эгіпт распачалі 27 красавіка ў Каіры афіцыяльныя перагаворы ў справе будучыні зоны Суэцкага каналу.

Рэакцыя ў Саветах на прамову Айзэнгаўэра. Цэнтральны партыйны ворган СССР «Правда», як і ўся іншая савецкая прэса, зьмясьціла 25 красавіка перадавыя артыкулы ў вадказ на апошнюю мірную прамову прэз. Айзэнгаўэра, сказаную 16 красавіка. У гэтых артыкулах высказваецца Савецкі Саюз толькі на карысьць «сур'ёзнага й трэзвага прадыскутаваньня існуючых разыходжаньняў у непасрэдных перагаворах або на форуме Задзіночаных Нацыяў». Высунутыя прэз. Айзэнгаўэрам і міністрам Даллесам перадумовы — заканчэньне вайны ў Карэі й Індакітаі, мірны дагавор з Аўстрыяй, задзіночаньне Нямеччыны і вольны выбар формы ўраду ў сатэлітных краінах — былі аднак станоўча адкінутыя.

Амэрыканская помач для разбудовы лётніцтва. У першы дзень канфэрэнцыі Рады Атлянтычнага пакту ў Парыжы быў падпісаны дагавор, на моцы якога Амэрыка асыгнавала 550 мільёнаў даляраў на прадукцыю самалётаў у Ангельшчыне, Францыі, Бэльгіі й Галяндіі.

Амэрыка мае прыняць дадаткова 240.000 імігрантаў. Прэзыдэнт Айзэнгаўэр зьвярнуўся 22 красавіка ў Кангрэс з дамаганьнем прыняць у двух наступных гадох па 120.000 імігрантаў звыш устаноўленых для паасобных краінаў кантынгентаў. У гэты новы кантынгент маюць увайсьці сьвежыя ўцекачы з за зялезнай заслоны.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Г. А. ТАКАЎ

Пра нутранае й міжнароднае становішча СССР

(Працяг, глядзі № 14—15)

ПАДЗЕІ Ў КАРЭЛА-ФІНСКАЙ ССР

Фінляндыя была акупаваная й прылучаная да Расеі ў 1809 годзе, але ў 1917 годзе выйшла із складу імпэрыі.

На пачатку 1939 году ў Маскве й Ленінградзе пад кіраўніцтвам праслаўленага квісьлінга Отто Куусінена пачалося фармаваньне крэмлёўскіх калёнаў зь ліку Фінаў і Карэлаў, што пражывалі на тэрыторыі СССР. Ленінградзкі дыктатар Жданаў, падводзячы вынікі супрацьлётніцкіх манэўраў гораду (1940), з салямонаўскай мудрасьцю заявіў, што «нашая арганізаванасьць і нашая моц прымусяць фінскіх рэакцыянэраў здрыгануцца й выбіраць між імпэрыялістычным Захадам і рэвалюцыйным Савецкім Саюзам; мы ня можам ставіцца абыякава да паводзінаў Фінляндыі, бо яна — наш сусед і нашая ўчарайшая тэрыторыя».

У канцы 1939 году палітбюро пачало сябе ўважаць гатовым да зьбіраньня «искони-русских земель» і да «выпраўленьня савецка-фінскай мяжы», а таму ськіравала Фінляндыі ультыматум з дамаганьнем аддаць востраў Ханко пад вайскова-морскую, вайскова-паветраную і наземную базы СССР. Але Фіны — народ харобры: не зважаючы на цяжкую стратэгічную сытуацыю, што напамінала чалавека, да лобу якога прыстаўлены пісталет, яны адказалі цьвёрдым **не.** Амбіцыйныя дыктатары пачуліся абражанымі і пусьцілі ў рух свой універсальны аргумэнт: сілу й насільле. Найбольшы тартуф XX стагодзьдзя, Вячаслаў Міхайлавіч Молатаў, якога Бэрыя называе абавязкава Вячаславам **Іванавічам,** у радыяпрамове з 29 лістапада абвесьціў нам, што савецкі ўрад, пастаўлены перад фактам фінскага нападу, даў загад чырвонай арміі распачаць вайну супраць Фінляндыі. У запраўднасьці ўсё адбылося наадварот.

Наступае добра ведамае. Міт пра непераможнасьць чырвонай арміі быў разьвеены. Фіны давялі нам на працягу кароткага часу, што за лёзунгам пра маральна-палітычнае адзінства савецкай грамадзкасьці хаваецца клубок супярэчнасьцяў, слабкасьцяў і заганаў. Чырвоная армія імкнулася да паняволеньня свабодалюбнага народу, да зьнішчэньня дэмакратычнай дзяржавы, да прыдушэньня нацыянальна-вызвольных імкненьняў, да калянізацыі ўжо раскалянізаванай краіны, значыцца, да глыбака несправядлівай, імпэрыялістычнай, рэакцыйнай, контррэвалюцыйнай мэты, а таму ейная ўдарная сіла сур'ёзна зьменшылася.

Фіны, наадварот, імкнуліся да мэты справядлівай, а таму сярод іх нарадзіўся масавы запал, стаіцкая мужнасьць, і іхная ўдарная сіла павялічылася непамерна. У гэтым — найвялікшая навука першага акту адкрытай імпэрыялістычнай экспансыі СССР. Калі народы змагаюцца за справядлівыя нацыянальна-вызвольныя мэты, іхная сіла ня можа вымярацца толькі дывізіямі.

Якраз у гэтым трэба шукаць радаводу падзеяў у Карэла-Фінскай ССР, што адбыліся між 18-ым і 19-ым зьездамі партыі.

ШТО Й ЧАМУ СТАЛАСЯ Ў КАРЭЛА-ФІНСКАЙ ССР?

Падчас другой сусьветнай вайны Фіны выступілі на баку Нямеччыны й паступалі з г. зв. «маскалямі» ні чуць ня лібэральней, чымся найлепшыя гітлераўскія эсэсаўцы. Чым гэта выясьніць? Ці тым, што Фіны й Карэлы пражылі больш стагодзьдзя ў складзе расейскай імпэрыі?!

Адказ ясны: яны на працягу кароткага тэрміну пасьпелі зьненавідзець савецкі «новы парадак»; вераломства 1939-40 г. г. асталося вельмі сьвежым у памяці; захапленьне раёнаў Карэльскага перашыйка, Кандалакшы й Петсама асталіся раскрытай крывавай ранай на целе Фінляндыі; СССР выступіў перад народамі Прыбалтыкі, як да цынізму аголены банкрот, што пасьпеў нанесьці непапраўны ўдар собскай рэпутацыі.

Яшчэ больш цынічныя падзеі адбыліся потым: у 1944 годзе спэцыяльная сэсія Вярхоўнага Савету правяла пастанову надаць саюзным рэспублікам права на «самастойныя» вонкавыя дачыненьні і на стварэньне рэспубліканскіх збройных сілаў, але навет на гэтай фарызэйскай маскарадзе Карэла-Фінская ССР апынулася дыскрымінаваным выключэньнем. Прапазыцыя аб уключэньні Кольскага паўвострава ў склад КФССР была адкінутая зь ненавісьцю; тэрыторыя Карэльскага паўвострава была ўключана ў склад РСФСР, а ня ў склад «раўнапраўнай» Карэла-Фінскай ССР. Я мушу заявіць, што аўтары гэтых прапазыцыяў ня мелі нічога супольнага зь якімі-небудзь распадзельнымі мэтамі — адзіная іхная мэта палягала на тым, каб даць маладой рэспубліцы тэрытарыяльнае й матарыяльнае падтрыманьне й гэтым зрабіць яе жыцьцяздольнай.

Прычыны? Крэмль ня можа дапусьціць, каб рэспубліка, вельмі зродненая зь Фінляндыяй, калі-небудзь магла загаварыць мовай: «мы самі з вусамі». Вынік? КФССР на поўначы й паўдні адрэзаная ад морскіх партоў, у яе заплеччы насаджаныя тэрытарыяльна-паліцыйныя кардоны. Гэты дурны крок зрадзіла не заспакаеньне, ня братнія пачуцьці, але псыхалягічнае агарчэньне, што, аднак, на балонкі прэсы ні разу не пранікла. Вынікам стратэгічнай і палітычнай прымітыўнасьці Сталіна—Молатава быў заданы яшчэ адзін удар узаемапаразуменьню народаў.

МІЛІТАРЫЗАЦЫЯ КФССР

Ад 1946 году Карэла-Фінская ССР была ваенізаваная прыскоранымі тэмпамі. Гэтташняе насельніцтва было перамешчанае з прыгранічнай паласы на Ўсход. Прагаліна запаўнялася вайсковымі пасёлкамі й мястэчкамі, стойкамі пагранічнікаў і іншай салдатнёю. Цікава адцеміць, што былі перамешчаныя навет канцэнтрацыйныя лягеры, якія займаліся прымусовымі лесанарыхтоўкамі.

Усё гэта не магло не адбіцца ня толькі на псыхалёгіі, а й на гаспадарскім разьвіцьці рэспублікі, што да канца 1948 году ня было здавальняючым. Ня прыпадкова ЦК ВКП(б) быў прымушаны тройчы займацца «выпраўленьнем памылак» партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў (1944, 1950 і 1952), пры чым апошняе ўмяшаньне кончылася разгромам ЦК КП(б) КФССР, зьмяшчэньнем Купрыянава й іншых кіраўнікоў.

Нявыкананьне плянаў лесанарыхтоўкі, зрыў плянаў вырабу паперы, шкодніцтва ў рыбнай прамысловасьці, сабатаж на некаторых прадпрыемствах, «буржуазны нацыяналізм», нізкапаклонства перад буржуазнай Фінляндыяй, — гэткімі былі асноўныя абвінавачаньні.

Вельмі цікавае новае абвінавачаньне: кажуць, што «пэўныя колы» КФССР, быццам, падпалі пад уплыў «фінскіх рэакцыянэраў», вымагалі зьліквідаваць савецкія вайсковыя базы на востраве Ханко, выдаліць савецкае акупацыйнае войска з гэтага вострава, ня прэтэндаваць на Аляндзкія астравы. Гэта ўжо бязумоўна ня «буржуазны нацыяналізм».

НОВЫЯ ЗАДАНЬНІ — НОВЫЯ ЗАХАДЫ ЦЭНТРУ

У якім кірунку разьвіваюцца карэла-фінскія падзеі сяньня?

Паваенныя «буржуазна-нацыяналістычныя» імкненьні й канвульсіі нагул ужо пераможаны, прыдушаны, выпалены распаленым зялезам. Нутранарэспубліканская сытуацыя болей ці меней устабілізавалася. Ад 1948 году эканамічны развой стаў на рэйкі ўзросту. Так, прыкладам, паводля афіцыяльных дадзеных, у 1951 г. у рэспубліцы было выпрадукавана паперы амаль у тры разы болей у параўнаньні з 1940 годам, улоў рыбы зболышыўся на 50% у параўнаньні з 1950 г. У новым нядаўнім пляне прадбачыцца павялічыць вываз дзерава ўтрая, так каб удзельная вага КФССР становіла ў цэлым СССР звыш 50%. Прадукцыя паперы павялічыцца прыблізна на 160-170%, у тым ліку газэтнай паперы на 370%.

З другога боку, вялізарны размах вайскова-марскога й іншага стратэгічнага будаўніцтва ў раёнах Фінскага заліву і Мурманска надае рэспубліцы, асабліва КФ чыгуначнай магістралі нябывалае ў мінуўшчыні значэньне ў вагульнай стратэгіі СССР на паўночным захадзе.

Вось чаму крэмлёўская алігархія ўжо не магла задаволіцца мінулым станам рэчаў, асабліва звальненьнем Купрыянава і ўзьвялічэньнем над КФССР пасярэдняга «вождя» Егорава, і была прымушана ўжыць сэрыю новых захадаў, у тым ліку павысіць ведамага квісьлінга Отто Куусінена да рангі партыйнага правадыра, да рангі галоўнага палітычнага дыктатара рэспублікі, да рангі надзвычайнага камісара Крэмля ў Петразаводзку. Здаецца ня будзе памылковым прыпускаць, што ўключэньне калішняга ватажкі камінтэрну і арганізатара «дэмакратычнай рэспублікі Фінляндыі» ў мястэчку Тэрыёкі у склад прэзыдыюму ЦК КПСС будзе азначаць, паза іншым, пасіленьне «рэвалюцыйнага» ўмешваньня СССР у нутраныя справы Фінляндыі.

(Далей будзе)

Я веру ў Беларусь

Спадар Хуан Торрэс Кордэро, чый артыкул, спэцыяльна напісаны для «Бацькаўшчыны», пачынаем ніжэй друкаваць, ёсьць адным з малодшых гішпанскіх публіцыстых, народжаны 3 лістапада 1926 г. у Сан Сэбастыян (край Баскаў, паўночная Гішпанія). Ягоны бацька быў замардаваны камуністымі на пачатку грамадзянскай вайны (1936—1939). Публіцыстычную кар'еру пачаў яшчэ маладым хлапцом, пішучы ў журнал «Ля Майана». Хутка ягоныя артыкулы пачалі паяўляцца ў многіх часапісах правінцыі «Лёрыда». Пасьля студыяў за граніцай, у 1948 г. вяртаецца ў Гішпанію для адбыцьця вайсковае службы, падчас чаго займае чаргова становішчы сакратара пры двух ваенных трыбуналах. У гэтым самым часе, паступова перайшоўшы ўсе шчэблі рэдакцыйнай герархіі, рэдагуе рэвью «Сігнэма», а таксама закладае і кіруе выдавецтвам журналу «Ірват». У 1949 г. назначаецца сябрам «Сталай Інтэрнацыянальнай Камісіі Дырэктараў Каталіцкіх Часапісаў» з цэнтрам у Парыжы. У 1950 г. вяртаецца ў родны горад і прысьвячае свае артыкулы праблемам Далёкага Усходу, зьмяшчаныя як перадавіцы ў часапісе «Унідад». Пераехаўшы ў Мадрыд, знаёміцца зь Беларусам сп. Я. Сурвілам — студэнтам тамашняга ўнівэрсытэту, а праз яго знаёміцца зь беларускім пытаньнем і ім моцна зацікаўліваецца. Ад 1950 г. усе свае прэсавыя артыкулы, магчымасьці радыёвых перадачаў і свой асабісты ўплыў прысьвячаў папулярызацыі беларускай справы ў Гішпаніі. Цяпер адведвае групы Беларусаў у іншых краінах Заходняй Эўропы ў якасьці спэцыяльнага карэспандэнта газэт: «Дыярыё ды Барсэлёна», «Ля Воз дэ Эспаня» і нацыянальнай прэсавай агенцыі, якая кантралюе каля 40 гішпанскіх газэт і часапісаў.

ХУАН ТОРРЭС КОРДЭРО

*

I

За маю галаву была вызначана камуністымі ўзнагарода і ячэйкі камуністычнай партыі занесьлі мяне на «чорную лісту», калі «Радыё Пірэнэіка»[1]) падало маё прозьвішча.

[1]) Радыяперадачы гішпанскіх камуністых з Масквы, кантраляваныя Крэмлём.

Да гэтага часу я думаў, што мая праца ў антыкамуністычным лягеры ёсьць нязначнай і што я прадстаўляў вартасьць блізкую нулю. Але камуністычныя радыяперадачы паказалі адваротнае і гэтым стварылі мне сатысфакцыю ў маім жыцьці, завочна засуджваючы мяне на сьмерць.

Вестка, якую многа маіх сяброў лічыла трагічнай, была для мяне штуршком да ўзмацненьня маей антыкамуністычнай дзейнасьці пад лёзунгам: «Свабода народам! Свабода чалавеку!»

Ад гэтага часу я сябе лічу ўключаным у сям'ю нерасейскіх народаў Савецкага Саюзу, якія засуджаныя расейскім бальшавізмам, над галовамі якіх вісіць камуністычны меч. Іхныя імкненьні да незалежнасьці сталіся й маімі імкненьнямі, і я чую, што ў маей душы прамаўляе голас: «Твае сябры на Беларусі чакаюць ад цябе дапамогі, яны цябе просяць ня сьхіляцца перад нічым і перад нікім, высока і моцна трымаць узьняты сьцяг антыбальшавіцкага змаганьня, просяць памагчы ім вызваліцца з пад крэмлёўскіх тыранаў . . .»

Беларусь!

Слаўны народ, прыгожы край, — Беларусь 25 сакавіка сьвяткавала 35-ую гадавіну незалежнасьці. Адныя называюць яе краем «вызваленым», другія — «паняволеным» . . . бальшыня-ж наагул ня ведае яе стагодняе трагэдыі.

Я ў сваіх уяўленьнях бачу гэты народ, сабраны каля цэркваў сваіх, слухаючы гукі званоў, прыпамінаючыя калішнюю свабоду. Хоць на дзяржаўных будынках Менску разьвіваюцца чырвоныя сьцягі камунізму і бальшавіцкія арміі распалажыліся паабапал Дняпра ці на палёх Гомельшчыны, Беларусь можа быць яшчэ вольнай, бо ў сэрцы кажнага Беларуса гараць паходні свабоды, якія ёсьць ціхім гымнам іх душаў: «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» . . .

(Заканчэньне на 3 балоне)

Р. СКЛЮТ

«Раськіданае Гняздо» Янкі Купалы

(Заканчэньне)

Аднак, Купалава лірыка дае некаторы матар'ял для меркаваньня аб тым шляху выхаду, да якога асабліва, як кажуць, ляжала сэрца самога паэты. У лірыцы гэтай праблема шляхоў выхаду наагул ці раз займала паэту, хоць, ізноў-жа, разьвязка найчасьцей пакідалася адчыненай. Гэтак, прыкладам, у вершы «Над Сьвіслачай» (зборнік «Шляхам Жыцьця», 1913) у форме рытарычна-пытальнай (і, значыцца, безадказавай) пералічаюцца блізу ўсе тыя выхады, што мы бачылі кагадзе ў «Раськіданым Гнязьдзе»: «Сам сабой ня знаеш, што рабіць, як жыць . . . ці . . . сьніць (як Зоська — Р. С.), ці пайсьці гасьцінцам долі ў сьвет шукаць (як у фінале п'есы, ці то шляхам Старца, ці то шляхам Незнаёмага — Р. С.), ці рацца, русалкам галаву аддаць» (г. зн. скончыць самагубствам, як Лявон, як Зоська ў спробах і трызьненьнях — Р. С.). У тым-жа 1913 г., калі выйшаў зборнік «Шляхам Жыцьця» і калі напісанае было само «Раськіданае Гняздо», у «Нашай Ніве» (№ 11) знаходзім Купалаў верш «Калі пачнуць», дзе ўпяршыню й выразна пазытыўна падаецца вобраз «вялікага сходу»: «Калі прыгнецены няпраўдай які зьнябудзецца народ, — тады зьяўляюцца прарокі і ўсенародны клічуць сход . . . Расьце на сходзе недавольства, а дудароў магутны хор пяе аб крыўдах і ўсіх кліча да новых праўд, да новых зор» (пасьля верш гэты ўвайшоў у зборнік «Спадчына»).

Але асабліва займае вобраз «вялікага сходу» Купалу ў 1918 г., поўным для паэты перажываньнямі рэвалюцыі 1917 г. і ейных беспасярэдніх вынікаў. У гэтым часе, на працягу трох адзін па адным наступных дзён (29-31 кастрычніка 1918 г.) Купала стварае лірычны цыкль зь сямёх вершаў вакол вобразу «вялікага сходу», як цэнтру. У цыкль уваходзяць вершы: «На сход», «Свайму Народу», «Песьня», «У дарозе» (29. X. 1918), «Час», «На прызьбе» (30. X. 1918) ды «У вырай» (31. X. 1918); усе гэтыя вершы пасьля ўвайшлі ў зборнік «Спадчына», але былі там ужо параськіданыя па розных аддзелах і мясьцінах. Адчыняецца цыкль добра ведамым нашаму грамадзтву вялікім вершаваным заклікам «На сход» («На сход, на ўсенародны, грозны, бурны сход . . .»), у якім паэта кліча свой «аграблены, закованы», дый «раськіданы» — «проч з радзімае зямлі» царамі й іхнымі наступнікамі — «раскаванымі рабамі» бальшавікамі народ на той-жа «вялікі сход, па Бацькаўшчыну» — на тое-ж усенароднае нацыянальна-рэвалюцыйнае паўстаньне. Мяркуючы з даты напісаньня вершу, ён не становіць сабою водгуку ані на «вялікі сход» Усебеларускага Кангрэсу 1917 г., ані на ягоны вялікі вынік — Акт 25 сакавіка 1918 г., як гэта можа стварыцца ўражаньне на аснове ўсталенай практыкі нашых газэтаў, што нязьменна-традыцыйна стараюцца перадрукоўваць гэты верш пры адзначаньні гэных падзеяў, а можа быць разгляданы адно як заклік да завяршэньня ўканаванае тымі падзеямі лініі нацыянальнае рэвалюцыі праз запраўды ўсенароднае, а ня толькі «кангрэсавае» ці «радавае» паўстаньне-«сход». Пазытыўнае дачыненьне да гэтага вобразу ў дадзеным вершы не пакідае ніякае няпэўнасьці. Тое-ж маем і ў вершы «Час» («Час склікаці ўжо грамаду на вялікую нараду, на вялікі сход! . .»), пры чым тутака ўпяршыню даецца заклік да паўстаньня ня толькі, сказаць-бы, парлямэнтарнага, «сходавага», але і ўзброенага, хай сабе й традыцыйнымі (ці мо паэтычна-эмблематычнымі) «цапамі й косамі»; сюды-ж прылягае й верш «Свайму Народу», што становіць сабою як-бы ўвабражальную прамову паэты да скліканага ім «вялікага сходу». Адылі, ад гэтых палкіх заклікаў, з гэтае сфэры жаданага паэта спушчаецца ў іншых вершах цыклю да сфэры ўсьведамлянае рэальнасьці й выразна бачыць там, што «ў дарозе» на «вялікі сход» «свайму народу» прадстаўляюцца рэальныя «буднія» перашкоды — і «цемра», і «імжака», і «звод», і «чары ночы», і «жах», і «злыдні», і «ліха», і — «стой! Канава . . .» («У дарозе»). А найбольшая мо перашкода — псыхалёгічная, у тэй векавым народным дазнаньнем выпрацаванай «дзядоўскай» псыхіцы пасывізму й пэсымізму, пры якой чалавек, «усё важачы розумам . . . ня здыбе дабра зьнікуль» і застаецца яму адно «на прызьбе ўсё сядзець і ў дальню даль глядзець» . . . («На прызьбе») — псыхіцы, што параджае сабой тую філёзофію, якую ў «Раськіданым Гнязьдзе» Старац вызнаваў годнай адно для тых, што «дажываюць». Гэтак, у вершаваным цыклі 1918 г., які ня месца тут разглядаць больш падрабязна, яшчэ раз распрацоўваюцца паэтам тыя-ж два шляхі выхаду, што выплываюць у фінале «Раськіданага Гнязда», пры чым тут ужо выразна выхад «вялікага сходу» падаецца як выхад жаданага, а выхад «дзедаваньня», «на прызьбе» ці старцаваньня ў сьвеце — як выхад рэальна-даступнага і нат уканаванага. Гэткае-ж дачыненьне паэтава да абодвух і ў «Раськіданым Гнязьдзе», пры ўсёй ягонай адчыненасьці: ён із Незнаёмым, Сымонам і Зоськаю ў жаданым і ідэальным, але ня менш і з Старцам у ўсьведамленым рэальным. Але ж, і з Старцам, бо «жыцьцё бярэ ў свае лапы, ох, як бярэ», «найбольш верх бярэ», бо — «ўвесь да дна трэба выпіць свой келіх жыцьця» (верш таго-ж 1913 г., што й «Раськіданае Гняздо», поўны таго-ж Старцавага прыняцьця жыцьця ў ягонай усеабсяжнасьці). Дый запраўднае «ідэйнае правадырства», па якім такая туга была ў Гарэцкага, ня ў тым, каб гадаваць ілюзіі аб адназначнасьці, просталінейнасьці, бесьперашкоднасьці, сказаць-бы, «бесьперасядчанасьці» шляхоў да жаданага й ідэальнага, а ў гатовасьці пайсьці й павесьці рэальным «шляхам жыцьця», адно каб «ніколі не здавацца», як казаў вялікі Шэксьпір і (барджэй за ўсё, зусім незалежна ад яго) Купалаў Старац, «ня выракацца Беларусі, як умеюць людзі», а ня ўмеюць гусі — гэтая традыцыйная нашаніўская рыфма да «Беларусі», «гусі-вырайніцы» (апошні верш цыклю 1918 г. — «У вырай») — нат тады, калі гэты рэальны «шлях жыцьця» завіваецца тым гусіным шляхам выраю — «ізь сьвету ў сьвет», паводля таго-ж Старца.

Няпоўнае разуменьне ідэяграфічнасьці «Раськіданага Гнязда» крытыкаю ішло цесна злучанаю параю з гэткім-жа недасканальным разуменьнем сваеасаблівасьці самога жанру твору, хоць некаторыя крытыкі й даволі блізка падыходзілі да гэткага разуменьня. Гэтак, успамінаны ўжо намі першы крытык твору, З. Бядуля добра адзначыў, што тут перад намі «скарэй паэмат, як драма», адылі не зьвязаў дадзенае рэчы з такімі ейнымі пепярэдніцамі ў Купалавым творсьцьве, як гэткія-ж «скарэй паэмы, як драмы» — «Адвечная Песьня», «Сон на Кургане», «На папасе» й некаторыя няскончаныя фрагмэнты, ад якіх ад усіх «Раськіданае Гняздо» ў гэтым дачыненьні розьніцца адно чыста вонкава — сваёй нявершаванасьцяй. Акад. Замоцін, сьцьвярджаючы «неазначанасьць жанру» твору (фактычна — усяго нязвычнасьць яго ў сыстэме тэарэтычна- й гістарычна-літаратурных поймаў, Купалаўскую сваеасаблівасьць і арыгінальнасьць), добра адкідаў значэньне «сымбалічнае драмы» й даволі блізка шукаў жаданага тэрміну ў «драме настрою» зь ейнай «лірыкай скрозь быт». Лірызм твору згодна адзначалі ўсе крытыкі, але разважаючы чыста нарматыўна, бачылі ў ім адно перашкоду драматызму й практычна — сцэнічнасьці. Месца драматызму ў п'есе даволі трапна, прынамся ў прынцыпе, вызначыў акад. Замоцін: «Перад намі — тэма высокай драматычнай важнасьці, але няма выразнай драматычнай кампазыцыі». На самой рэчы, месца лірызму й драматызму ў «Раськіданым Гнязьдзе», іхнае ўзаемадачыненьне й перапляценьне, робіцца зусім ясным і выясьняе ўсю сваеасаблівасьць дадзенага Купалаўскага жанру, калі ў шуканьні вызначэньня яго пайсьці як найглыбей і адыходзіць ад самых кардынальных поймаў зьместу й формы літаратурнага твору. Калі прызнаць, сьледам за Адамам Бабарэкам, што «зьмест — гэта тая жыцьцёвая задача, якая паўстае перад чалавекам або грамадою, нацыяй, клясаю, і тое яе разьвязаньне, якое вызначаецца быцьцём; форма — гэта працэс разьвязаньня гэтае задачы як-бы ў застыглым яго стане, гэта, так сказаць, другі мамэнт самое задачы й яе рэалізацыі», а таксама прыняць вельмі трапнае Гэгелеўскае адрозьненьне «нутраной» формы, як «закону зьяваў», і формы «вонкавае», як «адмоўнага мамэнту зьявы, несамастойнага й зьменлівага . . . вонкавага, абыякавага да зьместу існаваньня», дык уся сваеасаблівасьць разгляданага тутака Купалаўскага жанру выясьніцца ў тым, што зьмест у яго (Бабарэкава «жыцьцёвая задача», а таксама, хоць і ў вузейшым сэньсе — Замоцінава «тэма») — «высокай драматычнай вартасьці», высока-драматычны ў сваім характары, «нутраная»-ж форма (Бабарэкаў «працэс разьвязаньня задачы») — «высока-лірычнага напружаньня», чыста-лірычная, форма-ж «вонкавая» — драматургічная (вузей, але мо ясьней для зразуменьня самога прынцыпу гэткага разгляду, можна сказаць — дыялёгічная). Адсюль жанр гэты найдакладней і мог-бы быць вызначаны як «лірычна-драматычная паэма» (тэрмін «драматычная паэма»

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Узорная праца Беларусаў Аргентыны

Беларусы Аргентыны, якія, разам з 25-ым Сакавіком, адсьвяткавалі сёлета 5-ую гадавіну існаваньня й дзейнасьці свае нацыянальна - грамадзкае арганізацыі — Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне, заўсёды выказваюць шмат умеласьці, патрыятызму й ахвярнасьці ў сваей нацыянальнай працы і служаць узорам многім іншым нашым эміграцыйным асяродзьдзям, ня гледзячы на тое, што розныя цяжкасьці й перашкоды, якія мусяць перамагаць нашыя суродзічы на чужыне, тут бадай што найбольшыя. Зьмяшчаючы ніжэй справаздачы з гэтага падвойнага сьвяткаваньня, Рэдакцыя «Бацькаўшчыны» вітае Згуртаваньне Беларусаў у Аргетыне на парозе 6-га году ягонага існаваньня й жадае яму яшчэ большых пасьпехаў у ягонай нацыянальнай працы.

*

НАД ГРОБАМ ЭВЫ ПЭРОН

Дня 12 красавіка сёлета а гадзіне 10,30 дэлегацыя беларускай калёніі ў Аргентыне ўшанавала памяць Эвы Пэрон — Духовага Шэфа Аргентыны, складаючы вянок кветак на ейным гробе.



Дэлегацыя Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне пры гробе Эвы. Першы з права вянок зь белых красак ад ЗБА.

Божая Служба за Беларусь, ейны Народ і Ўрад БНР у Украінскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царкве ў Буэнос Айрэс 12. 4. 1953.

Гэтым актам распачалося падвойнае сьвята Беларусаў Аргентыны: вялікае нацыянальнае сьвята Абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі Актам 25 Скавіка і пяцігодзьдзе дзейнасьці Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне.

Дэлегацыя, якая складала вянок, складалася з 20-ці асобаў, рэпрэзэнтуючы Беларусаў амаль што з усіх мясцовасьцяў Буэнос Айрэс і бліжэйшых акругаў. Дэлегацыю прыняў Цэрэмоніяльны Шэф, які пакіраваў прабегам акту, пасьля чаго было ўпісана ў кнігу, ад каго і кім быў зложаны вянок, на якім красаваліся нацыянальныя калёры Аргентыны й Беларусі. Гэта ўсё фатаграфавалі прадстаўнікі розных газэтаў, а таксама й фатограф ЗБА.

СЛУЖБА БОЖАЯ ЗА БЕЛАРУСЬ

Пасьля злажэньня вянка ўсе пераехалі ў Украінскую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву, дзе адбылася ўрачыстая Служба Божая за Беларусь, яе Народ і Ўрад БНР. Служба распачалася прыгожымі словамі протопросьвіта Б. Арыйчука, які вітаў Беларусаў зь іхным Нацыянальным Сьвятам, просячы ўсіх узьнесьці свае малітвы да Ўсявышняга, каб Беларусь уваскрэсла, як Уваскрос Хрыстос.

СЯБРОЎСКІ ВЕЧАР

Гэтага-ж дня а гадзіне 18-ай у салёне Летувіскага Клюбу быў зарганізаваны сяброўскі вечар для запрошаных гасьцей: прадстаўнікоў Аргентынскай Улады, прадстаўнікоў іншанацыянальных калёніяў і журналістых аргентынскае й чужое прэсы.

У центры салёну, пад завешанымі сьцягамі Аргентыны й Беларусі, Пагоні і партрэту Прэзыдэнта Я. Д. Пэрона, заняті месца прадстаўнік Ураду БНР на Аргентыну й Старшыня ЗБА і ўсе прысутныя госьці й сябры. Першым было выступленьне Прадстаўніка Ураду БНР на Аргентыну сп. К. Мерляка, які ў гішпанскай мове прывітаў усіх прысутных і зрабіў абшырны даклад зь гістарычным нарысам, прадстаўляючы гістарычны развой беларускага народу, ягонае палажэньне ў міжнародным палітычным жыцьці. Пак канец зьвярнуўся да прадстаўнікоў Аргентынскай Улады, а праз іх і прысутных Аргентынцаў, да ўсяго народу краіны Сан Марціна, каб аказаў ён зразуменьне й дапамогу як маральную, так і матарыяльную беларускаму народу ў змаганьні за свае прыродныя правы і рэалізацыю Акту 25-га Сакавіка. Прэлегэнт, канчаючы сваю прамову, падзякаваў Уладам і Аргентынцам за іхную, ужо нам аказаную, помач і сымпатыю для беларускай вызвольнай справы.

Пасьля воклікаў «Хай жыве Пэрон», «Хай жыве Аргентына», «Хай жыве Вольная й Незалежная Беларусь», былі адыграныя аргентынскі й беларускі нацыянальныя гымны.

З чаргі ўзяў голас Старшыня Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне сп. Уладзімер Другавец, які ў беларускай мове коратка абрысаваў падзеі й абставіны, у якіх адбылося абвешчаньне Беларускай Народнай Рэспублікі, і пазьнейшае змаганьне за ажыцьцяўленьне Акту 25-га Сакавіка. Далей шырака паінфармаваў, як паўстала тут у Аргентыне нашая арганізацыя і што яна зрабіла за гэтых пяць гадоў. Ад імя сяброў зложыў падзяку закладчыкам яе і ўсім тым, якія актыўна ў ей працуюць, сьцьвердзіўшы, што арганізацыя стаіць на добрай дарозе і зь яе ня сыйдзе, бо гэта шлях кажнага Беларуса, у якога яшчэ ёсьць у душы хоць найменшая частка Бацькаўшчыны — Беларусі. З апошнімі словамі Старшыні загрымеў марш «Пагоня».

Далей усім прысутным гасьцём была ахвяраваная кніжка, якую выдала Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне ў гішпанскай мове п. н. «Беларусь і Беларусы ў Рэспубліцы Аргентыны».

ПРЫСУТНЫЯ ГОСЬЦІ

Ад Аргентынскіх Уладаў, апрача прадстаўніка Міністэрства Нутраных Справаў, быў прадстаўнік ад Дзяржаўнага Радыя і паасобныя прыяцелі Беларусаў у Аргентыне. Ад прэсы былі прысутныя карэспандэнты наступных газэт: «Эль Мундо», «Эль Горар», «Бальзас», «Наш Кліч», «Слёвэнска Рэпубліка», «Глос Польскі» і «Дзвін». Ад нацыянальных калёніяў у Аргентыне былі прысутныя наступныя дэлегацыі: ад Украінскага Цэнтральнага Прадстаўніцтва ў Аргентыне, Саюзу Палякаў у Аргетыне, Цэнтральнага Камітэту Вызваленьня Славаччыны, Згуртаваньня Латышоў у Аргентыне, Летувіскага Камітэту Вызваленьня Летувы, Нацыянальнай Грузінскай Арганізацыі ў Аргетыне. Ад паасобных арганізацыяў і нашых прыяцеляў быў Протопросьвітар Барыс Арыйчук, рэпрэзэнтуючы Украінскую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву, прадстаўнікі ад Украінскага Таварыства «Відроджэньня» і «Просьвіта».

Першым з гасьцей забраў голас Генэральны Сакратар Украінскага Цэнтральнага Прадстаўніцтва ў Аргентыне др. М. А. Рубінэц, які ў канцы сваей прамовы выразіў надзею ў хуткае зьдзейсьненьне ідэялаў, за якія змагаюцца народы Беларусі й Украіны. Далей выступіў Старшыня Латыскага Аб'еднаньня ў Аргетыне сп. Гайшас, які заклікаў да далейшага задзіночаньня ўсіх народаў у змаганьні ня толькі з камунізмам, але й наагул з усякім расейскім імпэрыялізмам. З чаргі выступіў ад імя Камітэту Вызваленьня Славаччыны ў Аргентыне ксёндз Антон Ледніцкі. Ён параўнаў лёс абодвых нашых народаў, падчырківаючы высокую мараль у змаганьні за волю сваіх народаў, як Беларусі, гэтак і Славаччыны. Заступнік Старшыні Саюзу Палякаў у Аргентыне інж. Станіслаў Сьлівінскі ў кароткіх словах выразіў надзею, што ў будучыні ня толькі Беларусы й Палякі, але і ўсе народы залагодзяць пасуседзку й папрыяцельску ўсе свае праблемы, якія сяньня непакояць іхных грамадзян. Генэрал Тодар Даўкантас, былы міністар Летувы ў Аргетыне, сказаў, між іншым, што летувіскі народ шануе свабоду другіх народаў, і калі гэтак будзе ў кажнага народу, дык усе будуць жыць шчасьлівым жыцьцём. Напасьледак забраў голас ад імя Грузінскай Калёніі ў Аргетыне др. Акакі Папава, які заявіў прысутным, што няма і ня можа быць ніякіх кампрамісаў у змаганьні за вызваленьне народаў з пад расейскага імпэрыялізму, які мусіць быць зьнішчаны раз назаўсёды, незалежна ад таго, пад якім калёрам ён выступае.

Між выступленьнямі іншанацыянальных прадстаўнікоў былі граныя беларускія песьні з плітак і дэклямаваныя вершы. Шмат воплескаў выклікаў верш Якуба Коласа «Беларускаму Люду», пра-

(Заканчэньне на 9 балоне)

„Беларусь і Беларусы у Аргентынскай Рэспубліцы"

Пад такім загалоўкам выйшла з друку інфармацыйная кніжка аб Беларусі і Беларусах у гішпанскай мове. Выданьне яе трэба заўдзячваць стараньням і ахвярнасьці Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне, а ў васаблівасьці быламу старшыні Згуртаваньня і цяперашняму прадстаўніку ўраду БНР у Аргентыне сп. К. Мерляку.

Гэтая кніжка прысьвечаная 5-ай гадавіне існаваньня Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне, а таму, як гэта слушна падчырківаецца ў прадмове, яна ня прэтэндуе быць ні вялікім літаратурным, ні навуковым творам, а мае за мету ў простай форме даць аргентынскаму грамадзянству запраўднае ўяўленьне аб Беларусі, у якога паняцьце аб Беларусах і Беларусі часта ёсьць мутнае. Адначасна гэтая кніжка пазнаёміць аргентынскае грамадзянства з жыцьцём і дзейнасьцю Беларусаў у Аргентыне.

Паяўленьне ў сьвет гэтай кніжкі мае вялікае значэньне ў беларускім вызвольным руху наагул. Гэта, хоць скромнае, але першае выданьне ў гішпанскай мове, якое інфармуе гішпанамоўны сьвет у запраўдным сьвятле аб гісторыі беларускага народу і ягоным змаганьні за дзяржаўную незалежнасьць.

Што да зьместу кніжкі, трэба сказаць, што, хоць яна ёсьць скромная й невялікая (76 балонаў), але апрацаваная паважна. Матэрыял падабраны цікавы і пададзены ў яснай, простай і даступнай форме для чытача, які слаба яшчэ арыентуецца ў беларускіх справах.

На першых балонках бачым партрэты: прэзыдэнта Аргентынскай Рэспублікі генэрала Пэрона і ягонай жонкі Эвіты — духовага правадыра аргентынскага народу, якія выказалі сваю шчырую прыхільнасьць да беларускай эміграцыі ў Аргентыне, прэзыдэнта БНР інж. М. Абрамчыка, прадстаўніка Рады БНР у Аргентыне К. Мерляка і старшыні Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне Ул. Другаўца.

Адразу пасьля прадмовы падаюцца ў скарочаньні геаграфічныя дадзеныя аб Беларусі з картай, паказваючай месца Беларусі сярод дзяржаваў Эўропы. Далей ідзе кароткі нарыс гісторыі Беларусі, у якім ярка насьветленыя найважнейшыя этапы ў гісторыі нашага народу да сяньняшніх дзён. Далейшая частка кнігі адлюстроўвае жыцьцё й дзейнасьць беларускай эміграцыі ў Аргентыне, а ў васаблівасьці дзейнасьць Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне. Апрача гэтага, падаецца дакладнае вылічэньне беларускіх арганізацыяў, навуковых інстытуцыяў і прэсы ўва ўсіх краінах сьвету.

На недахопаў кніжкі, апрача некаторых тэхнічных памылак, трэба залічыць у частцы гістарычнага нарысу апушчэньне так важнага мамэнту, як Слуцкае паўстаньне. Недастаткова насьветленая польская пэрфідная палітыка ў дачыненьні да нашага народу ў ягоныя найкрытычнейшыя мамэнты змаганьня за сваю незалежнасьць.

Наагул трэба выказаць шчырую падзяку ўсім тым, што прычыніліся да выданьня гэтай кніжкі — моцнага аружжа прапаганды за незалежнасьць Беларусі.

Трэба спадзявацца, што яна шырака прычыніцца да інфармацыі аргентынскага народу аб беларускай нацыянальна-вызвольнай праблеме.

Ч. Кукель

Выстаўка беларускае прэсы й выдавецтваў на чужыне, якая выклікала вялікае зацікаўленьне ў прысутных на сяброўскім вечары 12. 4. 1953 ў Буэнос Айрес.

ў дачыненьні да Купалавых «Адвечнае Песьні» й «Сну на Кургане» ўжо быў у вабыходку і ў прынцыпе правільны, хоць і менш дакладны; яшчэ менш дакладны, хоць таксама правільны ў прынцыпе, тэрмін «лірычная драма», тарнаваны часам да «Раськіданага Гнязда»).

Калі трымацца дадзенае роўніцы разгляду, зразумелай робіцца сваеасаблівасьць жанравасьці ня толькі дадзенага Купалавага твору й папярэдніх таго-ж тыпу, але і ўсяго Купалавага творства. Запраўды, удумаўшыся глыбей, ня цяжка прыйсьці да высноваў, што зьмест Купалавага творства заўсёды характарызуецца высокім драматызмам, найчасьцей у ягонай трагічнай адменнасьці, але нярэдка і ў вадменнасьці камічнай; нутраная-ж форма заўсёды ў прынцыпе лірычная, і гэтыя два кардынальныя мамэнты адзначаюць кажны канкрэтны Купалаў жанр, апошняя канкрэтная асаблівасьць якога канчальна афармоўваецца ўжо толькі вонкавай формаю. Гэтак і выходзіць, што пры апавядальнасьці вонкавае формы маем эпічны жанр Купалавае паэмы, гэтак добра разгледжаны сваім часам праф. Вазьнясенскім, пры чым устаноўленыя ім дачыненьні эпічнага, лірычнага й драматычнага мамэнтаў тут ідуць якраз па тэй лініі, што нарысаваная намі гэтта кагадзе; пры драматургічнасьці (дыялёгічнасьці) вонкавае формы маем Купалавы драматычныя жанры, пры недраматургічнасьці (маналёгічнасьці) яе — жанры лірычныя. У вапошніх двух выпадках, у залежнасьці ад характару самота драматызму зьместу — трагічнага ці камічнага — маем жанравыя адменнасьці кагадзе вызначанае лірычна-драматургічнае паэмы (пры трагічнасьці зьместу «Адвечная Песьня», «Сон на Кургане», «Раськіданае Гняздо» й інш.), або Купалавага фарсу (пры камічнасьці зьместу), або лірыкі ў вузкім сэньсе (пры трагічнасьці зьместу); падобную дэталізацыю, зрэшты, можна было-б правесьці і ў першым з названых вышэй выпадку вонкава-эпічных жанраў, але гэтая катэгорыя твору ня можа нас тут спэцыяльна цікавіць, будучы далейшай ад спэцыфікі разгляданага гэтта твору.

У тэй-жа роўніцы разгляду робіцца зусім зразумелай і тая розьніца талентаў Купалы й Коласа, найперш, а таксама кажнага зь іх ды Максіма Багдановіча з Алесем Гаруном, якую калісь так добра вызначыў Адам Бабарэка, схарактарызаваўшы Купалаў талент, як «лірычны», Коласаў, як «эпічны», а Багдановічаў і Гаруноў — як «трагічныя». Розьніца гэтая, як відаць цяпер, ідзець найперш па лініі нутраной формы, лірычнай у Купалы, эпічнай у Коласа і драматычнай (трагічнай) у Багдановіча з Гаруном, а тады — ужо й па лініі зьместу (у Купалы й Коласа — заўсёды драматычнага, а ў Багдановіча й Гаруна — заўсёды лірычнага), і ўжо адно наапошку — па лініі формы вонкавай, у якой эпічнасьць у поўнай і шырокай меры выкарыстоўвалася адно Коласам, а Багдановічам і Гаруном блізу не зачэпвалася, як і драматычнасьць (у Коласа яшчэ слабейшая за Купалаву, у выніку аслабленага дзеяньня эпічнае нутраное формы).

Жанравай сваеасаблівасьцяй Купалавае п'есы выясьняецца і слабасьць ейнае драматычнае кампазыцыі, адзначаная акад. Замоцінам. На самой рэчы, лірызм нутраное формы робіць пэрсанажаў п'есы лірычнымі, а не драматычнымі гэроямі й змушае весьці іхныя лініі асобна, а не ў вагульным спляценьні драматычнае дзеі. «Асобы п'есы, — добра казаў акад. Замоцін — занятыя сваімі клапотамі й горасьцямі й жывуць ня столькі ў дзеяньні, колькі ў размовах... Некаторая прысутнасьць дзеяньня адчуваецца яшчэ ня мог знайсьці гэткіх мамэнтаў драматычнага разьвіцьця сюжэту, ў пэрыпэтыях нешчасьлівага каханьня Зосі, але ў рэшты асобаў руху мала». Пры гэткім палажэньні ня дзіва, што той-жа Замоцін як завязка, кульмінацыя, разьвязка, агульных для дзеяньня цэлае п'есы, бо мамэнты гэтыя могуць быць знойдзеныя адно на паасобных лініях гэрояў (тае-ж Зоські найперш), а таксама — у межах паасобных актаў-дзеяў п'есы, у сувязі з выразнай дамінацыяй таго ці іншага гэроя ў тым ці іншым акце (Лявона — у першым, Зоські — у другім і г. д.). Адсюль і тая агульная драматычная «сырасьць» твору і ягоная «маласцэнічнасьць», як вынік гэтага.

Не зразумеўшы яксьледна жанравае сваеасаблівасьці «Раськіданага Гнязда», крытыка не магла трапна адшукаць і сваяцкіх яму твораў у сусьветнай літаратуры. Ізноў-жа, адзін З. Бядуля кінуў быў трапную думку, вяжучы Купалаву п'есу з драматургічнымі спробамі гэткага «лірыка наскрозь», якім быў Гайнрых Гайнэ, але наступная крытыка, нажаль, зусім занядбала гэтую Бядуляву зацемку (відаць, думаючы перш за ўсё катэгорыямі гэтак званае «тэматыкі», крытыкі не знаходзілі ніякіх пунктаў дотыку між Гайнаўскай і Купалаўскай драматургіямі, тымчасам як і Бядуля меў наўвеце, і наагул можна тут гаварыць адно аб жанрыстычным баку). Запраўды, дзьве ведамыя драматургічныя спробы Гайнэ (у аўтаравым вызначэньні «трагэдыі») — «Альманзар» (1820-21 г.) і «Вільям Ратклі́ф» (1822 г.), пабудаваныя зусім паводля вышэй выясьненага ўзору, з драматызмам трагічнага тыпу ў зьмесьце, лірызмам нутраное формы й драматургічнасьцяй аднае формы вонкавае. Сам Гайнэ ў эпіграфе да першае свае «трагэдыі» вызнаваў, што яна — адно «напалавіну трагічная дзея» і асабліва падчыркваў наяўнасьць у ёй «лірычных красак», «плястычнае формы», а нарэшце й найбольш — што «ўся ў цэласьці сваёй яна выходзіць з нутранога сьвету». Занядбаўшы слушнае Бядулява збліжэньне з Гайнэ, крытыка, найперш у васобе акад. Замоціна, пачала шукаць сваякоў «Раськіданага Гнязда», пэўна-ж, у расейскай драматургіі — у «драме настрою» Чэхава («Вішнёвы сад» ягоны здаўся Замоціну гэткім сваяком, пры разважаньнях катэгорыямі «тэматыкі» мо й не бяз рацыі, зь некаторай, хоць-бы адно й меншай, рацыяй у жанрыстычным пляне) ды Горкага. Купалаў Старац «прыпомніў крыху» Замоціну Горкаўскага Луку з «На дне» — хіба-ж, найбольш тым «прымірэньнем із старым бытам», якога, як мы бачылі, зусім няма ў гэтага пэрсанажа, як няма ў яго і вілаводнасьці-«лукавости» таго Лукі, і «суцяшальніцтва» шляхам умацаваньня зманных ілюзіяў у суцяшаных. Сьледам за Замоцінам і савецкаму Мазалькову той-жа Старац «дзе ў чым прыпамінае вандроўніка Луку з п'есы Горкага «На дне» — абодвы яны выступаюць у ролі вандроўных «філёзафаў-суцяшальнікаў» (і гэтага досыць!). Ды Мазалькоў цягне выснутую Замоцінам нітачку і далей — да сьцьверджаньня быццам-бы «ня толькі ідэйнага, але й беспасярэдняга ўплыву М. Горкага» на «Раськіданае Гняздо», бачачы апошні ў «вобразах дужых, гордых, сьмелых людзёў» (быццам-бы, рыхтык адзін Гаўрыла ў Полацку, Горкі — адзіны пясьняр «дужых, гордых, сьмелых») і навет — у стылі зь ягоным «багацьцем прыказак, прымавак, рыфмаваных народных выслоўяў, што вырашаюць народную мудрасьць»... Зрэшты, на стылі «Раськіданага Гнязда» нам трэба зараз спыніцца асобна, на канчатак усяго разгляду твору.

Народная паэтычнасьць стылю «Раськіданага Гнязда», дзякуючы якой мова твору насычаная вялікім лірызмам, вобразнасьцяй, музычнасьцяй, напару вельмі блізкай да вершаванасьці, асабліва ў сваёй вельмі частай разьмеранасьці-рытмічнасьці, згодна й слушна адзначаецца ўсімі крытыкамі. Пэўна-ж, крыніца гэтага — жывое паэтычнае творства нашага народу, а ніякі ня Горкі, ані ягоны маскоўскі фальклёр ніжнягародзкага мешчаніна. І Бядуля вельмі добра адзначыў, што ў тым, што ўсе асобы п'есы гавораць вельмі паэтычна й лірычна, няма нічога, як выславіўся ён, ненатуральнага: гэтак заўсёды гавораць людзі з нашага народу і ў горы і ў весялосьці, а тут-жа «ў горы ўся сям'я». Дык цалком натуральная паэтычная мова гэрояў «Раськіданага Гнязда» ня мае нічога супольнага із запраўды ненатуральнай, штучнай «усхваляванай мовай» эгзальтаваных пэрсанажаў іншых «драмаў настрою». Той-жа Бядуля вельмі добра зьвязаў паэтычны стыль разгляданага намі гэтта твору із стылем народных галошаньняў-плачаў па нябожчыках. І запраўды, стылем «Раськіданае Гняздо» — блізу суцэльнае галошаньне-плач па «раськіданай Бацькаўшчыне», глыбака народнае-фальклёрнае ў сваіх сяродках выражэньня. Калі часам, асабліва ў Зоські, прабіваюцца й іншыя мамэнты, не галашэннага й песеннага характару, як, прыкладам, у тэй сцэне вяночкаў з васількоў, якую Гарэцкі добра назваў «па сваей паэтычнай магутнасьці клясычным вобразам у нашай паэзыі», або характару казачнага, як у расказе свайго сну тэй-жа Зоськаю — дык усе яны вытрыманыя строга ў тым-жа народным-фальклёрным стылі, як і ў ім-жа вытрыманы й, сказаць-бы, ніжні, «рэальна-бытавы», паводля Замоціна, моўны плян твору. Шмат можна было-б сказаць і пра цікавыя паасобныя мамэнты самой народнай чысьціні мовы ў п'есе, але выпісваньне прыкладаў яе заняло-б шмат месца, тым больш, што ўважлівы да гэтага боку чытач лёгка зацеміць і можа аднатаваць сабе гэтыя мамэнты.

У моц усіх сваіх разгледжаных асаблівасьцяў «Раськіданае Гняздо» больш выйграе ў чытаньні, чымся ў сцэнічным паказе, як гэта добра адзначалі блізу ўсе ягоныя крытыкі, ад Бядулі й да Замоціна. Праўда, і на сцэне п'еса ніколі ня была «асьвістаная», як тыя Гайнавы «трагэдыі», пра якія вышэй згадвалася. І цяперака якраз з удачаю йдзець яна ў тэатрах Савецкай Беларусі, праўда, «ідэйна ачышчанай» — падагнанай пад вымаганьні сучаснага бальшавіцкага «сацыялістычнага рэалізму», а ў сувязі з гэтым — і пад ягонага «бацьку» Максіма Горкага, «уплыў» якога на Купалу гэтак стараюцца давесьці савецкія крытыкі, выцягваючы выпадковыя нітачкі, пакінутыя крытыкай хоць і не савецкай, а расейскай.

Чытаць і перачытваць Купалава «Раськіданае Гняздо», пэўна-ж, будзе вялікай прыемнасьцяй і для чытача-эмігранта — тае-ж птушкі з таго-ж «раськіданага гнязда», змушанай старцаваць «ізь сьвету ў сьвет» у надзеі й веры ў некалішні надыход вялікае часіны «вялікага сходу»...

Р. Склют

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Пётра Родзевіч

(У ДЗЕСЯТУЮ ГАДАВІНУ АРЫШТУ Й ДЗЕСЯТУЮ ГАДАВІНУ МУЧАНІЦКАЕ СЬМЕРЦІ)

У сакавіку і красавіку сёлета мінае дзесяць гадоў ад арышту й дзевяць гадоў ад мучаніцкай сьмерці Пётры Родзевіча. Як аднаму з найбліжэйшых супрацоўнікаў і прыяцеляў Нябожчыка, мне давялося дзяліць зь ім апошнія гады ягонага жыцьця, дзяліць і цяжкасьці ў змаганьнях, радасьць у перамогах і сум і цярпэньні за нашыя нацыянальныя ідэялы.

Пётра Родзевіч радзіўся ў Беласточчыне. Бацькі — сьведамыя Беларусы каталікі — далі яму моцнае нацыянальнае й рэлігійнае ўзгадаваньне. Скончыўшы пачаткавую школу, Нябожчык уступае ў кляштар а.а. Мар'янаў, дзе і прабывае некалькі гадоў. Выступіўшы з кляштару, канчае музычную школу ў Варшаве. Працуе пасьля як арганісты ў беларускіх каталіцкіх парахвіях. За сваю аднак беларускую дзейнасьць ня можа нідзе доўга ўтрымацца. Пасьля доўгіх захадаў атрымоўвае напасьледак працу настаўніка ў прыватнай школе, З прыходам у 1939 годзе бальшавікоў, ён пераяжджае ў Вільню. Пры летувіскай акупацыі Пётра Родзевіч бярэ вельмі актыўны ўдзел у беларускім нацыянальным жыцьці ў Вільні. Ён арганізуе хор, які сваімі выступленьнямі здабывае славу сярод жыхароў Вільні.

З прыходам Немцаў Пётра Родзевіч зьяўляецца адным з арганізатараў Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні і бярэ ўзноў-жа вельмі актыўны ўдзел у беларускім грамадзкім жыцьці. Беларускі Нацыянальны Камітэт хутка накіроўвае яго на працу ў Вялейшчыну, дзе малы беларускі актыў толькі пачынаў весьці цяжкае змаганьні з польскімі шавіністымі, якія навет і ў тыя часы не забыліся пра вялікую Польшчу «ад мора да мора». Расстрэлы беларускай інтэлігенцыі, масавыя і жорсткія расправы з нацыянальна актыўным сялянствам, далейшая палянізацыя праз школы, адміністрацыю й касьцёл —усё гэта прычыны, дзеля якіх шмат хто спасярод інтэлігенцыі пакінуў акругу, ня бачучы ніякай магчымасьці грамадзкай працы. Жменька-ж тых, што асталіся і распачалі, здавалася-б, безнадзейнае змаганьне, была малая, таму і прыезд новай адзінкі быў вітаны з радасьцю.

Пётра Родзевіч атрымоўвае назначэньне на школьнага інспэктара ў Сьвірскі павет, які найбольш стагнаў пад польскім прыгнечаньнем. Дзякуючы няўтомнай працы і энэргіі Родзевіча, тут хутка паўстаюць беларускія школы, арганізуецца беларускі хор і павет прыймае паволі ўзноў свой беларускі характар. З адыходам павету да Генэральнага Камісарыяту Летувы, Родзевіч вяртаецца ў Вялейку ізноў-жа, як школьны інспэктар павету. Тут арганізуе беларускі хор, а так-жа пачынае стараньні дзеля адкрыцьця беларускай настаўніцкай сэмінарыі.

Адначасна бярэ актыўны ўдзел ува ўсіх працах беларускага грамадзкага характару, здабываючы гэтым сярод мясцовага насельніцтва вялікую папулярнасьць. А калі завакавала становішча начальніка павету ў Вялейцы, мясцовы беларускі актыў хацеў мець на гэтым становішчы ня толькі цьвёрдага Беларуса, але й чалавека з адміністрацыйнай практыкай і моцным характарам, чалавека, якога нельга было-б застрашыць ані арыштам, ані сьмерцяй. Таму, пасьля некалькі месяцаў працы ў школьным інспэктараце, Пётра Родзевіч абыймае становішча начальніка Вялейскага павету. Як начальнік павету, дзе мясьціліся цэнтральныя ўлады акругі, ён патрапіў сканцэнтраваць у сваіх руках усе ніці беларускага нацыянальна-вызвольнага змаганьня. І калі нямецкі камісар акругі склікаў зьезд начальнікаў паветаў, дык напярэдадні зьезду заўсёды адбывалася ў памешканьні Родзевіча нарада беларускіх начальнікаў павету, на якой прыймаліся адпаведныя лініі што да становішча Беларусаў адносна нямецкай палітыкі ў вакузе.

У другой палавіне 1942 году амаль з кажным днём узрастала супрацьнямецкая партызаншчына, а разам з гэтым і шалеў тэрор Гэстапо. Створаны пры Гэстапо г. зв. беларускі сьледчы аддзел з расейскім правакатарам Вячэславам Перамыкінам на чале распачаў крывавую акцыю. Паленьне беларускіх вёсак, масавыя расстрэлы і паленьне жыўцом людзей, амаль штотыднёвыя эгзэкуцыі ў вялейскай турме — усё гэта было прычынай складаньня начальнікамі паветаў войстрых пратэстаў і ў акруговы камісарыят і ў Гэстапо. Нічога аднак не памагала. Перамыкін і ягоныя «малайцы», сярод якіх на ганьбу былі й Беларусы, «гуляў» па ўсей акрузе. І так напачатку сакавіка 1943 году банда Перамыкіна, шукаючы камуністых, напала на вечарынку моладзі ў вёсцы Халапы, прадмесьці Вялейкі. П'яныя гэстапаўцы ўварваліся ў хату, у якой адбывалася вечарына, застрэлілі дзевяць чалавек, дабілі раненых, іншым-жа ўдзельнікам у ліку каля 30 чалавек загадалі разьдзецца да бялізны і адвезьлі іх у такім стане ў вялейскую турму. Аб тым, што ўдзельнікі вечарынкі ня мелі нічога супольнага з камунізмам, сьведчыць між іншым і той факт, што ўсе арыштаваныя пасьля некалькі тыдняў былі з турмы звольненыя.

Вышэй пададзены выпадак узварухнуў усіх Беларусаў. Начальнік павету Родзевіч злажыў войстры пратэст у Гэстапо й акруговы камісарыят, а мясцовыя беларускія патрыёты наладзілі ўрачыстую паніхіду па замардаваных. На паніхіду зьявіўся, ясна, і П. Родзевіч. Ужо пад канец службы ў царкву ўвайшло некалькі гэстапаўцаў, а сярод іх і іхныя агенты Пётра Саўчыц і Кастусь Касяк. Дзеля таго аднак, што сама паніхіда па замардаваных была ў дзікім уяўленьні Перамыкіна ўважаная за супрацьнямецкую акцыю, удзельнікі яе, пераважна беларуская інтэлігенцыя наразіліся на гнеў усеўладнага Гэстапо. На публічнай зборцы Перамыкін заявіў, што 99% беларускай інтэлігенцыі гэта камуністыя, якіх трэба найхутчэй зьліквідаваць. У вадказ на гэтае асьветчаньне быў зложаны начальнікам павету войстры пратэст у Генэральны Камісарыят у Менску, перасланы службовай дарогай праз акруговага камісара ў Вялейцы. У вадказ на гэты пратэст — 23 сакавіка 1943 году Пётра Родзевіч быў арыштаваны нямецкім Гэстапо. Ягоны арышт ашаламіў беларускае грамадзтва Вялейшчыны і голасным рэхам адбіўся па ўсей Беларусі. Не памаглі ні пэтыцыі, ні пратэсты ў найвышэйшыя нямецкія ўстановы. Як і трэба было спадзявацца, тагачасны старшыня Беларускай Народнай Самапомачы др. Іван Ермачэнка адмовіўся ад усялякай інтэрвэнцыі на карысьць арыштаванага. Калі Чэслаў Найдзюк зьвярнуўся да яго з вышэйўспомненай просьбай, Ермачэнка адказаў: «Нічога рабіць ня буду. Так Родзевічу і трэба».

У турме прамучыўся Родзевіч больш году. Цяжкія турэмныя ўмовы, вошы, клапы, сьпярша толькі турэмны паёк былі ягоным удзелам. Сырыя сьцены турмы спрычыніліся да таго, што арыштаваны пачаў губляць слух. Ужо пазьней беларускае грамадзтва наладзіла матарыяльную помач арыштаванаму. Часта ён атрымоўваў падачкі ад сялян, навет яму асабіста няведамых, ад моладзі з настаўніцкай сэмінарыі. Гэтая-ж моладзь доўгія месяцы, вяртаючыся пасьля навукі із школы і ведаючы, у якой камэры сядзіць Родзевіч, здымала перад вокнамі турмы шапкі.

Нябожчык перажыў у турме шмат жахлівых допытаў, якія аднак не зламалі яго. Ня маючы іншых довадаў, Гэстапо абвінаваціла яго ў... польскасьці. Агент Гэстапо ўспомнены ўжо Саўчыц мусіў дзеля гэтых «довадаў» некалькі разоў выяжджаць у Вільно і іншыя гарады. Кастусь Касяк (ён разам із сваім шэфам Перамыкінам завіс у Вялейцы на шыбеніцы пасьля публічнага працэсу, наладжанага бальшавікамі ў 1945 г.), больш за першага спрытнейшы, дастаў фотографію Родзевіча ў сутане, а Саўчыц прыватныя лісты арыштаванага, пісаныя перад вайной папольску. Родзевіч астаўся ў турме, ня гледзячы на ўсе спробы вырваць яго адтуль. Напасьледак у красавіку 1944 году ён разам зь некалькімі вязьнямі быў вывезены ў вёску Гліннае, дзе ўсе былі ўкінутыя ў парожняе гумно. Гэстапаўцы далі некалькі стрэлаў, Родзевіч быў ранены, але жыў яшчэ. Тады гэстапаўцы кінулі некалькі гранатаў. Гумно пачало гарэць, а зь ім і вязьні.

Так закончылася жыцьцё Пётры Родзевіча. Памяць-жа аб ім доўга будзе жыць у насельніцтва Вялейкі й акругі, як аб адным з тых, якія аддалі жыцьцё для дабра Бацькаўшчыны.

А. М.

Голас сумленных Палякаў

(Заканчэньне)

цаў бяз згоды праўнай рэпрэзэнтацыі вольнага народу на бацькаўшчыне, сьцьвердзіў-бы толькі згоду на тарнаваньне правільных і справядлівых прынцыпаў, паводля якіх павінна адбыцца будучае разграніченьне».

Можна з польскім аўтарам згаджацца або не згаджацца ў пытаньні, што ў справе канчальнага вызначэньня нашых граніцаў будзе мець канчальны вырашальны голас праўнае прадстаўніцтва польскага народу на бацькаўшчыне. Мы, прыкладам, з такім цьверджаньнем абсалютна не згаджаемся й выключаем навет думку аб тым, што справу дзяржаўнай прыналежнасьці беларускіх тэрыторыяў будзе вырашаць паўнапраўны польскі прадстаўнік з Кракава ці Пазнаня. Гэтае пытаньне можа быць вырашанае толькі народам, што на гэтых землях жыве, г. зн. народам беларускім. Тым ня меней аднак становішча інж. Сьцібор-Рыльскага, як і становішча ўсей групы Палякаў, што гуртуюцца вакол часапісу «Ідземы», астаецца толькі прывітаць. Ужо навет такая пастаноўка справы шырака адкрывае дзьверы да шчырага супрацоўніцтва Беларусаў з успомненай групай. Шкада толькі, што Палякі, якія думаюць такімі катэгорыямі, як інж. Сьцібор-Рыльскі, належаць да рэдкіх выключэньняў.

Р. С.

Цяжкая нямецкая праблема

(Заканчэньне)

іць Захад. У далейшым Саветы маглі-б таксама разьлічваць на падпарадкаваньне сабе ўсяе Нямеччыны. Эвэнтуальнае задзіночаньне Нямеччыны мусіла-б пацягнуць за сабой заключэньне зь ёю мірнага дагавору, пасьля чаго былі-б выведзеныя зь ейнае тэрыторыі акупацыйныя арміі. І ў той час, калі Саветы патрабавалі-б адцягнуць свае дывізіі толькі ў Польшчу, а найдалей у Беларусь, збройныя сілы заходніх альянтаў апынуліся-б за каналам, а навет за акіянам. Гэта наразіла-б Нямеччыну на небясьпеку збройнага на яе нападу з савецкага боку або яшчэ чутчэй на небясьпеку збройнага перавароту ў самой Нямеччыне. Справа ў тым, што Заходняя Нямеччына зьяўляецца абсалютна няўзброенай у той час, калі Ўсходняя Нямеччына мае разбудаваныя й адданыя Саветам збройныя сілы ў форме г. зв. «народнай паліцыі», якія за савецкімі інструкцыямі маглі-б пасадзіць у Бэрліне паслухмяны Саветам урад. У сувязі з гэтым ня можа быць сумліву, што Амэрыка згодзіцца толькі на такое задзіночаньне Нямеччыны, якое выключала-б такія магчымасьці. Але на гэта ў сваю чаргу ня згодзяцца Саветы. Апрача гэтага, Усходняя Нямеччына, прытрымліваючыся тых-жа інструкцыяў Крэмля, дамагалася-б дэфінітыўнага прызнаньня ўсходніх нямецкіх граніцаў з Польшчай па лініі Одры й Найсы, на што ня згодзіцца Заходняя Нямеччына, дзе рэвізіяністычныя тэндэнцыі апошнім часам вельмі сільныя. Гэта ўсё прамаўляе за тым, што ключ да разьвязаньня нямецкага пытаньня так хутка знойдзены ня будзе, а таму халодная вайна за Нямеччыну ня спыніцца.

ПЕРШЫЯ СУКЦЭСЫ КАНЦЛЕРА АДЭНАЎЭРА

Дзьве вядучыя партыі Нямеччыны — урадавая Хрысьціянская Дэмакратычная Вунія (ЦДУ) на чале з канцлерам саюзнай нямецкай рэспублікі Адэнаўэрам і апазыцыйная Сацыялістычная Партыя Нямеччыны (СПД) на чале з сваім лідэрам Оленгаўэрам па рознаму заглядаюцца на ўзаемадачыненьні Нямеччыны з Захадам. Абедзьве партыі зьяўляюцца антысавецкімі і абедзьве высказваюцца за сувязь Нямеччыны з Захадам. Але калі партыя Адэнаўэра падтрымлівае форму ўзаемадачыненьняў з Захадам, устаноўленую ў генэральным дагаворы Нямеччыны з трымя заходнімі вялікадзяржавамі і ў дагаворы аб уключэньні Нямеччыны ў эўрапэйскую абаронную супольнасьць, дык сацыялістычная апазыцыя ўважае гэта за недастатковае й наважана дамагаецца праграмы максімальнай. Яна дамагаецца поўнай раўнапраўнасьці Нямеччыны ў сям'і вольных народаў Захаду, чаго дагавор аб эўрапэйскай арміі, які забараняе Нямеччыне мець незалежныя ад эўрапэйскай арміі збройныя сілы, ёй не дае. Апрача гэтага, сярод апазыцыі пакутуе пагляд, што мілітарная нэўтральнасьць і няўзброенасьць Заходняй Нямеччыны зьяўляецца найлепшай перадумовай міру й ейнае бясьпечнасьці, а ейная рэмілітарызацыя хутчэй можа справакаваць вайну.

Выпрабаванаму нямецкаму палітыку й вялікаму энтузіястаму супрацоўніцтва з Захадам канцлеру Адэнаўэру, ня гледзячы на сільную апазыцыю, удавалася да апошнята часу зь вялікім пасьпехам праводзіць у жыцьцё сваю палітычную лінію. На гэтым шляху ён мог пахваліцца двумя вялікімі сукцэсамі. Першым зь іх была ратыфікацыя 6 сьнежаня мінулага году ніжняй палатай заходнянямецкага парляманту («Бундэстаг») генэральнага дагавору й дагавору аб удзеле Нямеччыны ў эўрапэйскай арміі вялікай бальшынёй галасоў (218 супраць 164), а другім — ягоная, нядаўна закончаная, трохтыднёвая візыта ў ЗША, якая была вялікай маніфэстацыяй амэрыканска-нямецкай прыязьні. Гэтая візыта была трэйцяй у радзе заплянаваных візытаў прадстаўнікоў дзяржаваў вольнага сьвету ў ЗША. Распачаліся яны адведзінамі амэрыканскай сталіцы прэм'ерам Вялікабрытаніі Чэрчылем, далей візытай міністра замежных справаў Вялікабрытаніі Ідэна й міністра фінансаў Батлера, а трохі пазьней — францускага прэм'ера Маера й міністра замежных справаў Францыі Бідо. Але ніводзін шэф эўрапэйскай дзяржавы ня быў так авацыйна ў Амэрыцы вітаны, як нямецкі канцлер Адэнаўэр. Гэтая паездка Адэнаўэра ў Амэрыку паказала, што ЗША зьяўляюцца станоўча наважанымі мець Нямеччыну на сваім баку й зрабіць зь яе свайго галоўнага саюзьніка ў Эўропе.

АМЭРЫКА Й ЭЎРАПЭЙСКАЯ АРМІЯ

Плян эўрапэйскай абароннай супольнасьці, заініцыяваны былым францускім міністрам абароны Плевэнам, быў увесь час горача падтрымліваны Амэрыкай. ЗША ўважаюць, што эўрапэйская армія з выдатным удзелам у ёй нямецкіх дывізіяў, — гэта адзіная форма арганізацыі абароны Заходняй Эўропы. Таму Амэрыка ўсякімі спосабамі націскае на прысьпяшэньне ратыфікацыі заходнеэўрапэйскімі парлямантамі дагавору аб эўрапэйскай арміі. З гэтай мэтай адбылі сваё дзесяцідзённае падарожжа па Эўропе ў канцы студзеня й пачатку лютага сёлета міністар замежных справаў ЗША Даллес і дырэктар узаемнай бясьпечнасьці Стассэн.

Дакладнае становішча Амэрыкі ў справе эўрапэйскай арміі і ўдзелу ў ёй Нямеччыны найлепей спрэцызаваў міністар Даллес на прэсавай канфэрэнцыі 23 красавіка сёлета ў Парыжы, дзе ён прыймаў удзел у 11-ай канфэрэнцыі Рады Атлянтычнага Пакту. «Я ня веру, што Эўропа зможа пасьпяхова бараніцца перад інвазіяй чырвонай арміі, калі ня будуць прыцягнутыя да абароны нямецкія збройныя сілы» — заявіў ён даслоўна. Даллес асьветчыў, што няма іншай дарогі для прыцягненьня да эўрапэйскай абароны нямецкіх збройных сілаў, як толькі дарога эўрапэйскай абароннай супольнасьці. «Немцы ў ролі абсэрватара?» — паставіў міністар Даллес пытаньне. І адразу-ж на яго адказаў: «Магчыма для Французаў, але не для Амэрыканцаў». Ён-жа афіцыяльна падчыркнуў, што паводля Амэрыкі, як і на думку канцлера Адэнаўэра, аб нямецкай нацыянальнай арміі, ня зьвязанай з абароннай сыстэмай Захаду, ня можа быць і мовы. Таксама ўважае за немагчымае прыняцьце Нямеччыны да Атлянтычнага пакту, бо Францыя, якая ў НАТО мае права вэта, станоўча супраць такога праекту.

Вялікія засьцярогі да эўрапэйскай арміі з удзелам Нямеччыны мае, як ведама, ейная ініцыятарка Францыя, у якой вельмі моцны традыцыйны страх перад узбраеньнем Нямеччыны хоць-бы толькі ў рамах эўрапэйскай арміі. На апошняй канфэрэнцыі Атлянтычнай Рады ў Парыжы міністар замежных справаў Францыі Бідо ў сваей прамове выразна даў да зразуменьня, што Францыя ня хоча сьпяшацца з ратыфікацыяй дагавору аб эўрапэйскай арміі, уважаючы за мэтазгоднае пачакаць да вынікаў плянаванай канфэрэнцыі чатырох вялікадзяржаваў у справе задзіночаньня Нямеччыны.

Міністар Даллес, выведзены зь цярплівасьці такімі паступкамі Францыі, напасьледак паставіў справу ультыматыўна. У сваей прамове, сказанай на Радзе Атлянтычнага Пакту, ён заявіў зусім выразна, што 1) Амэрыканскі Кангрэс мог-бы ня прызнаць фінансавай помачы для эўрапэйскіх запрызьненых дзяржаваў, калі да мамэнту дэбатаў над гэтай справай, г. зн. у чэрвені сёлета, дагавор аб эўрапэйскай абароннай супольнасьці ня будзе паасобнымі дзяржавамі ратыфікаваны; 2) Амэрыка не захоча пасылаць у Эўропу сваіх войскаў і ў выпадку вайны змагацца між іншым і ў вабароне Нямеччыны, калі-б самі Немцы мелі адыгрываць ролю пасыўных абсэрватараў.

Гэтая грозная перасьцярога Даллеса мела прынамсі той вынік, што Рада Атлянтычнага Пакту прыняла рэзалюцыю, якая дамагаецца шыбкай ратыфікацыі парлямантамі паасобных дзяржаваў дагавору аб эўрапэйскай абароннай супольнасьці. Гэта, аднак, яшчэ ня значыць, што пачатак рэалізацыі дагавору ўжо блізкі.

НОВАЯ НЯЎДАЧА

Справа канчальнай ратыфікацыі дагавораў пацярпела вялікую няўдачу ў самой Нямеччыне. Вышэйшая палата нямецкага парляманту («Бундэсрат») 24 красавіка на прапазыцыю Бадэн-Вюртэмбэргіі адлажыла ратыфікацыю дагавору аб эўрапэйскай арміі й г. зв. генэральнага дагавору 20 галасамі супраць 18 да часу выясьненьня саюзным канстытуцыйным судом у Карльсрутэ, ці гэтыя дагаворы зьяўляюцца згоднымі зь нямецкай канстытуцыяй. Падзея гэтая на столькі яшчэ сьвежая, што сяньня цяжка гаварыць, якія яна будзе мець далейшыя вынікі. У кажным выпадку ёсьць ясным, што справа рэалізацыі эўрапэйскай абароннай супольнасьці апынулася ў вельмі крытычнай фазе. Гэты ўдар, які нечакана зваліўся на Нямеччыну, віцэ-канцлер нямецкай саюзнай рэспублікі Блюхэр назваў «чорным днём у гісторыі нямецкага народу».

Язэп Каранеўскі

Я веру у Беларусь

(Заканчэньне)

*

Час ад часу мне хочацца выклікнуць: Званы Менску, Званы Свабоды, разгойдайцеся, моцна зазваніце і скажыце забыўшаму вас сьвету тое, што вы ведаеце, — скажыце ім, што Расейцы ніколі не маглі вас «вызваляць», бо вы былі вольнымі 25 сакавіка 1918 году і яшчэ раней, калі гаспадарыў князь Усяслаў..., скажыце ім, што Беларусь яшчэ вольная, бо кажны Беларус носіць у сэрцы сваім запаленую паходню свабоды, — скажыце ім, што Беларусы ня ёсьць «расейскім народам», а Беларусь якой-небудзь расейскай правінцыяй, — скажыце ім, каб яны ніколі не забываліся, што Беларусь гэта нацыя эўрапэйская й хрысьціянская, што яна мае права быць вольнай, сувэрэннай, незалежнай, як Францыя, Швайцарыя, Ангельшчына..., — скажыце ім, што беларускі народ ужо вызваляецца з пад маскоўскай акупацыі!..

*

Ведаючы гісторыю Беларусі, мы забавязаныя сказаць: якім гэраічным ёсьць жыцьцё гэтага народу, які навет у сяньняшніх умовах спараджае бясстрашных партызанаў, што змагаюцца за вольную ад камуністычных наезьнікаў Бацькаўшчыну.

Ня раз думаючы аб гэтым, хочацца й мне стацца сынам Беларусі, думаць, як яны, гаварыць і сьпяваць паіхняму і... памерці за іхнюю шляхотную справу.

Для іх, відаць, няма скарэньня, для іх ёсьць толькі вера ў сваю будучыню й змаганьне аж да перамогі.

Я веру ў Беларусь упэўнена, усім сваім сэрцам. І таму я чуюся задаволеным, будучы загадзя асуджаным камуністымі на сьмерць.

Чаму я быў імі засуджаны на сьмерць?

Хуан Торрэс Кордэро

(Далей будзе)

Узорная праца...

(Заканчэньне)

дэклямаваны зь вялікім пачуцьцём сп. Г. Мерляк. Ня меншае захапленьне выклікаў верш Янкі Купалы «Царскія дары», які прадэклямавала Ганна Губэрт. У канцы многія прасілі тэксту гэтага верша з мэтаю пераклумачэньня яго на іншыя мовы.

Пад канец вечару быў уручаны памяткавы пэргамін, на якім прысутныя злажылі свае подпісы, Старшыні ЗБА. У гэты мамэнт забраў голас ад прысутных Аргентынцаў сп. Мануэль Канібано, які сказаў, што Беларусы ў вельмі кароткім пэрыядзе часу, які зьяўляецца ўсяго пяцігадовым, здабылі давер і сымпатыю ня толькі ў урадавых колах Аргентыны, але й ува ўсім аргетынскім народзе сваёю працаю й сваім змаганьнем за справядлівыя правы чалавецтва, правы. якія павінны мець Беларусы й якія мусяць быць усімі ўшанаваныя. Ад сяброў злажыла падзяку ўправе за праробленую працу сяброўка Вольга Гейхрох.

Апрача ўсяго гэтага, вялікім цэнтрам зацікаўленьня прысутных была выстаўка беларускай эміграцыйнай прэсы й выдавецтваў, удала прыгатаваная сп. Мікалаем Лянкевічам.

Усе прысутныя вынесьлі мілае ўражаньне, а ў Беларусаў асталося задаваленьне з таго, што зь вялікім пасьпехам і ўдачаю выканалі свой грамадзкі абавязак на чужыне.

Буэнос Айрэс, 15. 4. 1953.

К. Мацкевіч

СПРАВАЗДАЧА ФОНДУ ХВОРЫХ У БЭЛЬГІІ АД 1. 1. да 1. 4. 1953

Сальдо з 1952 г. — 8,50 бэл. франкаў. Зложаныя ахвяры: І. Грамыка — 50,00, Т. Чыжак — 100,00, Вольга Юрэвіч (ЗША) 224,00, Згуртаваньне Беларусаў Канады — 979,00, сабрана ад студэнтаў — 100, А. Міцкевіч — 103,00, др. Б. Рагуля — 500,00, др. У. Набагез — 200,00, Р. Козловіч — 100,00, А Дуброўскі — 40,00, Р. Занкоўскі — 50,00; **разам 2.474, 50 франкаў.** Апрача гэтага адтрымана адзін пачок з вопраткай ад Беларускага Студэнцкага Згуртавньня ў Лювэне.

З гэтага была выдадзеная дапамога: А. Кабычкіну (Аўстрыя) — 360,50 франкаў, пераказана ў распараджэньне Беларускага Жаночага Згуртаваньня ў Нямеччыне — 1.500,00 фр., А. Трусаву (Францыя) — 261,00, М. Скварцу (Бэльгія) — 100,00; перасылка грошаў і канцылярскія расходы — 103,00, падарожжа — 80,00; **разам 2.420,50 франкаў.**

УРАД ФОНДУ

З прычыны дэвізовых абмежаваньняў грошы за «Бацькаўшчыну», як і за кніжкі, выдадзеныя «Бацькаўшчынай» з усіх краінаў паза Нямеччынай просім перасылаць на рукі нашага фінансавага прадстаўніка ў Бэльгіі паводля наступнага адрасу:

Janka Žučka, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011